**НЕВЯДОМЫЯ ДЗЁНЬНІКІ БЫКАВА.** старонкі **8-10**

№ 23 (381) 18 чэрвеня 2004
www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы

**Выбары ў эўрапарлямэнт**
Яўка ў Гайнаўцы — 7%. Яўген Вапа: «Гэта вялікая беларуская насьцярожанасьць».
старонка 2

**Чэкісты Лукашэнкі**
Яны гатовы былі ўзяць на сябе ролю гарантаў Ягонай бясьпекі.
старонка 5

**Эўра-2004**
Расклад трансьляцый.
старонка 13

**Promenade**
Што беларусам даспадобы, для швэдаў — звычайная зьява.
старонка 15

**Музэй без Дырэктара**
Звальненьне Алеся Белакоза.
старонка 4

# Сытыя спагадалі галодным



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Нацыянальны страйк у падтрымку галадоўнікаў.

Што на Казарменным?
старонка 3

**17 чэрвеня прадпрымальніцкае аб'яднаньне «Пэрспэктыва» ладзіць агульнарэспубліканскі страйк у падтрымку галадоўнікаў.**

## Балтыка чакае

«Наша Ніва» абвяшчае конкурс для падпісчыкаў. Галоўны прыз пераможцу — адпачынак на Балтыйскім моры.

Дасылайце копіі падпісных абанэмэнтаў на 2-е паўгодзьдзе 2004 году на адрас Рэдакцыі. Наш адрас: а/с 537, 220050, Менск. Дасылаць можна й факсам на нумар (017) 284-73-29 або, адсканаваўшы, праз электронную пошту nn@promedia.by.

Падпісны індэкс 63125. Падпіску прымаюць на любой пошце, а ў Менску — і на шапікі «Белсаюздруку» ды ў прыватным агенцтве «Эй Бі ПрэсСэрвіс». Цана на месяц — 2580 рублёў на поштах або 1800 рублёў на шапікі «Белсаюздруку». Гэта нашмат таньней, чым ураздроб.



**Апошні дзень падпіскі 25 чэрвеня**

## «Ідэальна было б, каб пасада прэзыдэнта перайшла да палітыка залатой сярэдзіны»

**Прымаючы дапамогу Захаду, апазыцыянэры ператвараюцца ў дысыдэнтаў, лічыць Аляксандар Рар. Палітоляг А.Рар — галоўны ў Нямеччыне экспэрт па Беларусі. Яго лічаць «голасам Эўропы» пры камэнтаваньні падзей у нашай краіне. 45-гадовы А.Рар з 1994 г. працуе ў Нямецкім таварыстве замежнай палітыкі, дзе ўзначальвае аддзел СНД і Расеі. Гутарка з палітолягам адбылася ў Празе падчас сэмінару «Новыя суседзі Эўразьвязу».**



**«НН»: Ці бачыце вы нешта новае ў палітыцы Беларусі?**

**Аляксандар Рар:** Не. Няма знакаў, што Беларусь неяк па-новаму асэнсоўвае сваю геапалітычную і геастратэгічную ролю ў новай, вялікай Эўропе. Адзінае новае — зыгзагі ў дачыненьні да Расеі. Аднак і тут разрыў настолькі істотны, што прэзыдэнт Беларусі ўсё больш трапляе ў ізаляцыю, цяпер ужо ня толькі ад Эўразьвязу, у якой ён знаходзіцца ад 1997 г., але і ад Расеі. І гэта ўжо для эканамічнага разьвіцьця краіны, для будаўніцтва незалежнасьці Беларусі небясьпечна.

**«НН»: Вы думаеце, Расея можа адыграць пазытыўную ролю ў Беларусі ў бліжэйшыя гады?**

**А.Р.:** Расея цяпер занятая кансалідацыяй уласнай дзяржаўнасьці. У ёй пераважаюць аўтарытарныя, а не дэмакратычныя тэндэнцыі. Гэта зьвязана з унутранымі праблемамі. Яна не ідзе ў бок дыктатуры, але змагаецца з карупцыяй, алігархіяй, аднаўляе дзяржапарат, перабудоўвае адносіны цэнтру з рэгіёнамі. У Расеі няма цяпер замежнапалітычных магчымасьцяў настолькі ўплываць на дэмакратычныя працэсы ў Беларусі, як гэта можа рабіць Эўразьвяз, разам з новымі членамі арганізацыі. Але нельга дапусьціць, каб Беларусь стала каменем спатыкненьня, аб'ектам геапалітычных баталій паміж Расеяй і ЭЗ, хоць многія экспэрты лічаць, што тыповай праблемай у адносінах паміж Расеяй і пашыраным ЭЗ менавіта і можа стаць не Ўкраіна, а Беларусь, бо яна сапраўды «краіна ў прамежку», шэрая зона, што можа ствaрыцца між ЭЗ і Расеяй.

Працяг на старонцы 11.

КАЛЁНКА РЭДАКТАРА

# Пра што ня пішуць у газэтах

«Работа над памылкамі надвор'я», «Віцебск: ёсьць ідэі», «Сяло адродзяць новыя тэхналёгіі» — гэта загалоўкі сьвежай дзяржаўнай прэсы. Ні слова пра галадоўку дэпутатаў, самую незвычайную дый самую значную падзею палітычнага жыцьця. Маўчаньне тых, чыя прафэсія — гаварыць, інфармаваць, лёгка тлумачыцца. Напісаць пра галадоўку добра ці дрэнна — усё адно трэба паясьніць, *чаму* ўлада так упарта адмаўляецца ўвесьці ў выбарчае заканадаўства элемэнтарныя нормы празрыстага падліку галасоў, а паясьніць гэта з выгадай для ўлады немагчыма. І колькі такіх тэмаў, пра якія афіцыйныя выданьні — ні гу-гу!

Ці можа быць лепшы аргумэнт на карысьць незалежнасьці СМІ, чым гэтыя панурыя фігуры ўмаўчаньня?

**Андрэй Дынько**

**Эўраінтэграцыя застаецца ідэяй палітычных элітаў, але не народаў. Такую выснову можна зрабіць зь нізкай яўкі на выбары ў Эўрапарлямэнт, што адбыліся ў 25 краінах ЭЗ. Папуліст Анджэй Лепэр найбольш пацярпеў ад нізкай актыўнасьці палякаў. Толькі 4-е месца на выбарах — кепскі падарунак да дня нараджэньня гэтага польскага аднагодка Лукашэнкі. На фота Лепэр — з тортам ад прыхільнікаў.**


WWW.GAZETA.PL

# Параза польскага Лукашэнкі

У Польшчы галоўным вынікам выбараў у Эўрапарлямэнт стала нізкая выбарчая актыўнасьць (20%). На Беласточчыне яна асабліва мізэрная. У Гайнаўскім павеце на ўчастку прыйшло толькі каля 7% выбарцоў. Мо дзеля гэтага зусім слаба (11% галасоў) выступіла «Самаабарона» — партыя Анджэя Лепэра, якога называюць польскім Лукашэнкам.

З 54 месцаў Польшчы ў Эўрапарлямэнце больш за ўсё атрымала ліберальная «Грамадзянская платформа» — 15. Далей ідуць нацыянальна-каталіцкая Ліга польскіх сем'яў, кансэрватыўны «Закон і справядлівасьць», і толькі на чацьвёртым месцы — «Самаабарона». З 7 працэнтамі галасоў у палітыку вярнулася партыя польскай інтэлігенцыі — Унія свабоды.

Такі нізкі ўдзел у выбарах тлумачыўся тым, што ў мінулы чацьвер было сьвята, выйшла чатыры выхадныя і шмат хто не вярнуўся зь міні-адпачынкаў. Зрэшты, адмысловцы не маглі растлумачыць, чаму і ў першыя вольныя выбары ў 1991 г. на ўчастку прыйшло толькі трохі больш за 40% палякаў.

«Гэта проста насьцярожанасьць і недавер. Нашы людзі мяркуюць, што нічога не бывае задарма: калі нешта абяцаюць, то нечага ад цябе і хочуць. Гэта такая вялікая беларуская насьцярожанасьць», — тлумачыць старшыня Беларускага зьвязу ў Польшчы і рэдактар «Нівы» Яўген Вапа.

Тадэвуш Івіньскі, дзяржсакратар канцылярыі прэзыдэнта Польшчы, сказаў нам, што Польшча цяпер будзе мець больш шанцаў уплываць на палітыку Эўразьвязу ў дачыненьні да Беларусі, бо польскія дэпутаты ў Эўрапарлямэнце будуць уздымаць гэтае пытаньне ў часе пасяджэньняў.

**АДз, Варшава**

НАВІНЫ

### Зачыняюць Інстытут гісторыі?

Паводле інфармацыі «НН», на стале ў Міхаіла Мясьніковіча ляжыць рашэньне аб ліквідацыі Інстытуту гісторыі Акадэміі навук. Дырэктар інстытуту Мікалай Сташкевіч такую інфармацыю зьняпраўджвае.

### Прычэпкі да ЭГУ

Эўрапейскі гуманітарны ўнівэрсытэт не прайшоў атэстацыі Міністэрства адукацыі. Афіцыйнай пастановы пакуль няма, але старшыня камісіі па атэстацыі прапанаваў не атэстоўваць унівэрсытэту і правесьці паўторную атэстацыю ў 2005 г. Афіцыйнае заключэньне чакаецца на працягу месяца. Сярод прычын для адмовы ў атэстацыі — адсутнасьць у ЭГУ ўласнага інтэрнату, базы адпачынку і дактарантуры. Кіраўніцтва ўнівэрсытэту абмяркоўвае далейшыя захады, прыём студэнтаў на наступны год не адмяняецца.

### Эканамічны бум працягваецца

ВУП Беларусі ў студзені—траўні 2004 г. вырас на 10,2% проці таго ж пэрыяду 2003 г., паводле Міністэрства статыстыкі. Калі перападлічыць вынікі паводле нормаў Сусьветнага банку, паказчык будзе ніжэйшым, але толькі на 1%.

### Пускаюць расейскае піва

Расейскія бровары атрымаюць падарунак ад беларускага ўраду, калі будзе прынята рашэньне аб адмене ліцэнзаваньня на імпарт піва. Такі праект перадаў ва ўрад канцэрн «Белхарчпрам». Ліцэнзаваньне было ўведзена ў 2002 г. і зрэзала імпарт у два разы. Газэта «Белорусский рынок», паведамляючы аб праекце, зьвязвае яго з сочынскімі дамоўленасьцямі Лукашэнкі й Пуціна.

### Памёр Шавялевіч

У сераду Менск разьвітаўся з рэжысэрам Віктарам Шавялевічам, аўтарам «Пасткі для зубра» і дакумэнтару «Тварам да Вас» (спэцпрыз Канскага фэстывалю). Кінэматаграфіст пахаваны на Ўсходніх могілках.

### Адамкус проці Прунскене

77-гадовы былы прэзыдэнт Літвы Валдас Адамкус мае найлепшыя шанцы на перамогу ў прэзыдэнцкіх выбарах. За яго ў першым туры прагаласавала каля 28% выбарцаў. 27 чэрвеня ў другім туры яму будзе супрацьстаяць экс-прэм'ерка Казімера Прунскене. За лідэрку малявядомай Сялянскай партыі і Новай дэмакратыі, якую падтрымаў «імпічнуты» Раландас Паксас, галасавала 22% выбарцаў.

### Асыміляцыя народаў Расеі

Менш за 20% прадстаўнікоў карэнных народаў поўначы Расеі валодаюць роднай мовай свайго этнасу, паведаміў аддзел аналізу перапісу насельніцтва расейскай статыстычнай службы. Доля карэнных народаў у насельніцтве нацыянальных рэгіёнаў таксама нідзе не перавышае 40%. Эвэнкі, ханты ды іншыя народы засяляюць надзвычай багатыя на прыродныя багацьці рэгіёны, якія Расея каланізуе ад XVIII ст.

### ЗША: нацыя мільянэраў

Паводле зьвестак «The Wall Street Journal», у 2003 г. колькасьць амэрыканцаў, што валодалі капіталам, большым за 1 млн даляраў, вырасла на 14%.

**МБ; БелаПАН; gazeta.ru**

### Ліцэйскае лета

**21 чэрвеня** сэзон абароны Беларускага ліцэю «Лета-2004» адкрыецца а 12-й на Кірава, 21 пікетам «Я люблю ліцэй», прысьвечаным завяршэньню экстэрнату і году ў падпольлі. Увечары — дыскатэка. **23 чэрвеня** — ліцэйскі Дзень здароўя. Увесь калектыў выяжджае на прыроду, дзе адбудуцца спаборніцтвы й адпачынак. **24 чэрвеня** — другая вулічная акцыя, на гэты раз з пэрформансамі, у 16.50 на Кірава, 21. **27 чэрвеня** — генэральная трэніроўка ліцэйскае футбольнае каманды перад удзелам у Кубку Незалежнасьці. **30 чэрвеня** — пэрформанс ля будынку Ліцэю. **5 ліпеня** — ліцэйскі канцэрт ля сьценаў будынку. Ліцэісты запрашаюць моладзь зь іншых школ далучацца і знаёміцца. Тэл. 668-58-21.

### Ушанаваньні Быкава: удакладнены расклад

**18 чэрвеня** на філфаку БДУ а 10-й гадзіне — адкрыцьцё мэмарыяльнай шыльды, прысьвечанай памяці Васіля Быкава.

А 18-й гадзіне ў той жа дзень (а не ў суботу, як паведамлялася раней) — вечарына ў Доме літаратара, прысьвечаная памяці Васіля Быкава.

**19 чэрвеня** на Маскоўскіх могілках з 13 да 15-й гадзіны — ускладаньне кветак на магілу Васіля Быкава.

**22 чэрвеня** а 18-й у Беларускім ПЭН-Цэнтры — прэм'ера дакумэнтальнага фільму «Васіль Быкаў. Вяртаньне» рэжысэра Віктара Корзуна.

**25 чэрвеня** — імпрэза «Васіль Быкаў і Нямеччына» ў гістарычнай майстэрні на вуліцы Сухой у Менску.

АПЫТАНЬНЕ «НН»

# Задам наперад: Беларусь у Эўразіі

18 чэрвеня А.Лукашэнка возьме ўдзел у чарговым саміце Эўраазіяцкае эканамічнае супольнасьці (ЭўрАзЭС) у Астане і адначасова — у саміце Дамовы пра калектыўную бясьпеку. У ЭўрАзЭС уваходзяць Беларусь, Казахстан, Кіргізія, Расея і Таджыкістан, у ДКБ — яшчэ й Арменія. Паралельна з ЭўрАзЭС Беларусь удзельнічае ў Адзінай эканамічнай прасторы «чатырох» з удзелам Украіны.

Дзяржавы-ўдзельніцы па-рознаму бачаць прастору, што самі ўтварылі. Не ва ўсіх краінах ёсьць кансэнсус у пытаньні ўдзелу. Толькі беларуская ўлады ангажуюцца ў розныя «аэээсы» някрытычна. Наколькі выгодна далучэньне Беларусі да Эўраазіяцкай эканамічнай прасторы? **Адказваюць экспэрты — старонка 11.**

# Росель хоча Жлобін сабе


PHOTO.BYMEDIA.NET

**«Мы зацікаўленыя ўдзельнічаць у прыватызацыі Беларускага мэталюргічнага заводу», — заявіў 15 чэрвеня ў Менску губэрнатар Сьвярдлоўскай вобласьці Расеі Эдуард Росель. Ён таксама паведаміў, што прэм'ер Беларусі не мяркаваў аб поўнай прыватызацыі жлобінскага заводу, «але стварыць асобную вытворчасьць з трубнага стану, вылучыць яго з БМЗ і прыватызаваць — от што мае сэнс». Пікантна, што беларускі ўрад ніколі публічна не заяўляў пра праекты прыватызацыі аднаго з найкаштоўнейшых прадпрыемстваў краіны. На здымку: Эдуард Росель і віцэ-прэм'ер Андрэй Кабякоў (справа).**



# «Прессбол» пра Эўра-2004

«У гэтым месяцы мы атрымаем футбол рафінавана эўрапейскі, без «іншакантынэнтальных» прымесяў і адценьняў. Падобная старасьвецкая замкнёнасьць у спалучэньні з высокім узроўнем відовішча — на цяперашнія часіны рэдкасьць. Гэта як «Тыдзень высокай моды ў Парыжы»: безгустоўнасьць і друганснасьць практычна выключаны.

Цяперашні чэмпіянат — першы з топ-турніраў, які сувэрэнная Беларусь убачыць без пасярэднікаў і ў поўным аб'ёме — выключна па нацыянальным тэлеканале. Калі жадаеце, гэта экзамэн. Для пэрспэктыўнай генэрацыі камэнтатараў, узгадаваных за апошнія год-два. Для заўзятараў, якім варта быць шляхетнымі і талерантнымі ў прывыканьні да пакуль неакрэплых этэрных галасоў».

Расклад трансьляцый — **старонка 13.**

# Магілёў — радзіма сланоў

У гісторыі другой сусьветнай вайны адкрыўся новы ключавы момант — гэта абарона Магілёва ў 1941-м. Усё часьцей ідзе гаворка пра наданьне Магілёву статусу гораду-героя. Драмтэатар Беларускай арміі адкрыецца 24 чэрвеня таксама п'есай менавіта пра абарону гораду на Дняпры «Памятаеш, Алёша?», адмыслова напісанай Дударавым. Дарэчы, акурат з Магілёўшчыны паходзіць Аляксандар Лукашэнка.

**МБ**

галадоўка ў абарону Канстытуцыі:

# Марына Багдановіч, адзіная жанчына на Казарменным

**Яшчэ адзін тэрмін Лукашэнкі — і грамадства дэградуе цалкам, мяркуе Марына Багдановіч. Таму яна, старшыня Менскай абласной арганізацыі Аб'яднанай грамадзянскай партыі, у ліку першых далучылася да галадоўкі дэпутатаў адразу пасьля яе пачатку, 4 чэрвеня.**
**Яе дзед быў камандзірам выведкі ў аддзеле Лабанка. «Пароль мяняецца апоўначы» — гэта кніга і пра яго, разьведчыка на мянушку Колька Белы. У 44-м яго прыгаварылі да 15 гадоў за тое, што жывым вярнуўся зь небясьпечнага заданьня, і саслалі ў Варкуту.**
**Яе бацькі, пражыўшы 30 гадоў разам, разьехаліся, бо кожны быў патрыётам сваёй краіны. Тата — у Эстонію, маці засталася ў Расеі. Унучка палітвязьня маладой дзяўчынкай прыехала на радзіму дзеда і засталася ў Беларусі.**

**— Марына, чаму ў цябе зьявілася ідэя далучыцца?**

— Калі я ішла разам з маленькай дачкой на плошчу Незалежнасьці 3 чэрвеня, ніякіх такіх думак не было. На бліжэйшыя дні ў мяне былі абсалютна іншыя пляны. Мой бацька замовіў нам домік на беразе мора ў Эстоніі, куды мы з дачкой зьбіраліся ехаць адпачываць. І вось я ўбачыла, што дэпутатаў толькі трое. Вакол іх было шмат народу, але ніхто ня ведаў, чым дапамагчы. І рашэньне зьявілася інтуітыўна: трэба падтрымаць гэтых людзей.

**— Цябе спрабавалі адгаворваць?**

— Мяне ўсе адгаворвалі. Адразу ж узьнікла нейкая сьцяна неразуменьня. Адзін Багданкевіч сказаў: «Чыста пачалавечаму я б табе параіў: «Марына, не рабі гэтага». Але калі ты вырашыла, гэта сапраўдны ўчынак». Я абзваніла сваіх сяброў па партыі і сказала: «Хлопцы, я лічу, адзінае, што мы можам зрабіць, гэта далучыцца да галадоўкі. Каб не шкадаваць потым, што не зрабілі гэтага».

**— А як у сям'і паставіліся да твайго рашэньня?**

— Сын, якому ўжо 20 год, спачатку быў катэгарычна супраць. «Падумай пра дачку», — казаў ён. Але потым яго стаўленьне пачало мяняцца. А дачку, ёй 9 год, я адправіла ў Ліду да яе бабулі. Калі яе адвозілі, яна таксама ведала, што я іду на галадоўку, і перажывала страшна. Але выціскала зь сябе ўсьмешку: «Мамачка, усё добра, да пабачэньня». Я ганаруся, што дачка так трымаецца.

**— Іншыя мэтады змаганьня апазыцыя вычарпала? Галадоўка — гэта крайні захад, ці ня так?**

— Іншых крайніх мэтадаў змаганьня я проста ня бачу. Мяне на адным з ланцугоў неабыякавых людзей, дзе я раздавала ўлёткі, забрала міліцыя. За гадзіну праз кабінэцік, у якім мяне трымалі, прайшло адзінаццаць міліцыянтаў, якія хацелі паразмаўляць са мной. Яны казалі: «Улёткі — гэта мала. Бярыце зброю». Я кажу: «Я страляць ня ўмею». А яны: «Мы вас навучым». Ужо нават міліцыянты кажуць, што патрэбны іншыя мэтады. Але гісторыя паказвае, што, калі зьмена ўлады адбываецца сілавым шляхам, да дабра гэта не прыводзіць.

**— І на які эфэкт у грамадстве ты разьлічваеш ад галадоўкі?**

— Знаёмыя тэлефануюць і кажуць: «Здавалася, што ўсё. Адзіны шлях — альбо зьяжджаць, альбо ператварацца ў шэрую масу. А цяпер вы вяртаеце надзею, што ўсё можа зьмяніцца». Дагэтуль апазыцыя толькі адказвала на крокі Лукашэнкі. А дэпутаты гэтым разам зрабілі крок першымі. Гэта важна. Бо яшчэ адзін тэрмін Лукашэнкі — і грамадства дэградуе цалкам.

**— Як астатнія дэпутаты, што жывуць у доме, рэагуюць на вашае суседзтва?**

— Як выказваецца Фралоў, імкнуцца прашмыгнуць як мышы. Усе хочуць утрымацца пры ўладзе яшчэ на адзін тэрмін.

**— Затое на ўвагу міліцыянтаў не выпадае скардзіцца?**

— Яны зьнялі кватэру ў доме насупраць і ўсталявалі кругласутачнае назіраньне. Калі а 18-й гадзіне штодзень да пад'езду падыходзяць людзі, каб падтрымаць нас, здымкі відэакамэрамі вядуцца з трох пазыцыяў. Наведнікам, якія шукаюць наш дом, людзі ў цывільным кажуць: «Там ужо ніхто не галадае, АМАП іх разагнаў».

**— На сваякоў галадоўнікаў ціснуць?**

— У Гены Ананьева (ён з Воршы) цяжкая абстаноўка. Ноччу тэлефануюць, па суседзях ходзяць і распытваюць пра Гену. У жонкі застаюцца начаваць сваякі. Мы мяркуем, што можа адбыцца нейкая правакацыя, напрыкладператрус, калі могуць падкінуць нешта накшталт «пісталета Марыніча».

**— Генэрал Фралоў быў перанёсшы інфаркт. Які ў яго цяпер стан?**

— Ён трымаецца надзвычай годна. Я не перастаю захапляцца генэралам. Некалькі разоў яму было кепска, але пры гэтым ён заўсёды імкнецца жартаваць. Гэта чалавек вялізнай мужнасьці і сілы волі. На мінулым тыдні яго павезьлі на агляд у навуковы цэнтар кардыялёгіі. Прычым па папярэдняй дамоўленасьці. Але калі ён прыехаў, спэцыялісты, якія павінны былі яго абсьледаваць, разьбегліся. І аглядала нейкая маладая дзяўчынка пасьля інстытуту. Я ўпэўнена, што нікога б з працы за агляд Фралова ня выгналі. Сорамна і брыдка ад усяго гэтага.

**— Астатнімі мужчынамі ты гэтаксама захапляешся?**

— Сяргей Скрабец раскрыўся зь вельмі цікавага боку. Я пачула, як ён іграе на гітары. Я раней лічыла яго больш прыземленым, ну, як у нас камэрсантаў уяўляюць. А аказалася — зьмястоўны чалавек. Віця Івашкевіч — настолькі тактоўны, ніколі не адцягвае на сябе лішнюю ўвагу. Зь ім можна ісьці ў выведку.

**— А як ты спраўляешся з мужчынамі ў побытавым пляне?**

— Спачатку некаторым трэба было разы тры нагадаць, каб хутчэй прыбіралі ложкі. Гэта іх крыўдзіла, канечне. Яны ж у нас усе лідэры. А тут я лезу зь нейкім парадкам. Але цяпер звыкліся. Усе яны аказаліся совамі, адна я жаваранак. Першы тыдзень не маглі састыкаваць спальны графік. Цяпер такіх праблемаў у прынцыпе не ўзьнікае. Мы сталі як адна сям'я.

Працяг на старонцы 11.



**Марына Багдановіч: Іншых мэтадаў змаганьня я ня бачу. Я адзіная жанчына сярод галадоўнікаў. Спачатку некаторым трэба было разы тры нагадаць, каб хутчэй прыбіралі ложкі. Гэта іх крыўдзіла, канечне. Яны ж у нас усе лідэры. А тут я лезу зь нейкім парадкам. Але цяпер звыкліся**

Андрэй Лянкевіч




**Марына не выходзіць на двор, толькі на балькон: калі яна выйдзе ў двор, яе затрымаюць, каб даставіць у суд за спробу разьбіць палаткі ў двары дому генэрала Фралова 5 чэрвеня.**

Андрэй Лянкевіч

## Чаго патрабуюць галадоўнікі

Тры дэпутаты і 16 чалавек, якія далучыліся да іх, выставілі тры патрабаваньні:
— унясеньне зьменаў у Выбарчы кодэкс;
— вызваленьне Міхаіла Марыніча;
— абарона Канстытуцыі (не — антыканстытуцыйнаму трэцяму тэрміну для Лукашэнкі).

## Якія зьмены ў Выбарчы кодэкс?

22 чэрвеня палата прадстаўнікоў мае разглядзець тры прынцыповыя зьмены, якіх дамагаюцца дэпутаты Парфяновіч, Фралоў, Скрабец, дэмакратычная апазыцыя і дэмакратычны сьвет:
— выбарчыя камісіі павінны складацца ня толькі з прадстаўнікоў улады, але і апазыцыі, каб не было махлярстваў пры падліку галасоў,
— назіральнікі павінны атрымаць права сачыць за дзеяньнямі камісій і падлікам галасоў,
— адмена датэрміновага галасаваньня: зьмесьціва скрынак датэрміновага галасаваньня лёгка падмяніць у ноч перад выбарамі, а на выбарах 2001 і 2003 гадоў вынікі датэрміновага галасаваньня і галасаваньня ў дзень выбараў чамусьці радыкальна розьніліся нават паводле афіцыйных зьвестак.

Улада адмаўляецца ўнесьці такія зьмены, хоць менавіта такія нормы дзейнічаюць ва ўсіх суседніх зь Беларусяй краінах.

## Як сустрэцца з галадоўнікамі?

**Штовечар а 18-й яны выходзяць да людзей у двор дому на Казарменным завулку, 4 (ст.мэтро «Першамайская»).**



АЛЕСЬ ЮРКОЙЦЬ

# Музэй без Дырэктара

Звольнены з працы Алесь Белакоз — славуты настаўнік, стваральнік і, да мінулай суботы, нязьменны дырэктар дзяржаўнага Літаратурна-краязнаўчага музэю ў Гудзевічах. Прычынай звальненьня, лічыць Белакоз, сталі яго палітычныя погляды: «Я ніколі не здымаў бел-чырвона-белага сьцяжка зь пінжака. Я заўсёды выступаў за незалежнасьць Беларусі».

Загадчык аддзелу культуры Мастоўскага райвыканкаму Ўладзімер Свістуноў тлумачыць звальненьне станам здароўя: «Яму ўжо 76 год. Ёсьць жа заканадаўчыя акты: дзяржслужачы павінен працаваць да 65 гадоў. Белакоз можа працаваць у музэі, пакуль жыве, але не дырэктарам».

Апошнюю экскурсію ў музэі А.Белакоз правёў 5 чэрвеня для дваццаці гарадзенскіх настаўнікаў. Дарэчы, першую экскурсію ў 1968 г. праводзіў таксама для настаўнікаў.

Непакой аб тым, што з адыходам Белакоза Гудзевіцкі музэй страціць прыцягальнасьць, выказвае і новая дырэктарка Вольга Клімуць, былая намесьніца і вучаніца А.Белакоза. «Ён мог і надалей працаваць дырэктарам. Многія прыяжджалі ў Гудзевічы, каб пазнаёміцца зь Белакозам, паціснуць яму руку».

Сам А.Белакоз яшчэ не паставіў у біяграфіі музэю апошняй кропкі: «Хачу даць апісаньне кожнаму экспанату. Яны ўсе ж прайшлі праз мае рукі, ад першага да апошняга...»

**Павал Мажэйка**

## Ад рэдакцыі

**Ці ёсьць «палітыка» ў звальненьні Белакоза? Верагодней, у гэтым факце прысутнічае «эканоміка». Патрэба здабываць грошы на ўборачныя змушае райвыканкамы круціцца ўюном на патэльні, ашчаджаючы на ўсім, на чым можна. А на літаратурна-краязнаўчым музэі можна зэканоміць. Ну к чаму там тыя хаткі з ручнікамі? Хай стаяць, але заробку ня просяць. Але дзеля гэтага трэба спачатку пазбавіць музэй статусу дзяржаўнага, які ён атрымаў у 1990 г. Пры баявым дырэктару Белакозу такое было зрабіць немагчыма.**

**Аднак выціскаць Белакоза з «Музэю Белакоза» амаральна. Дырэктар такога музэю — як дэгустатар віна ці балетмайстар. На такіх пасадах пэнсіі не бывае, творца мае права працаваць, пакуль сам адчувае сілу.**

**Закрыцьцё ж унікальнага вясковага музэю было б хамствам і дурасьцю. Ні ў якай іншай краіне Эўропы такога б не зрабілі.**

# У Раёўцы здранцьвеньне

У ліпені споўніцца год, як мясцовая кардонная фабрыка цалкам спыніла сваё існаваньне. Яна і да мінулага лета прыкладна з год не працавала, але людзям прынамсі штомесяц выплачвалі па 30 тысяч рублёў. А ў мінулым ліпені павесілі на дзьверы вялікі замок ды паставілі ўсіх на ўлік у службе занятасьці. Круціцеся як хочаце.

Шэсьць гадоў таму фабрыка адзначала сваё 100-годзьдзе. Прыяжджалі журналісты, фотакарэспандэнты — занатоўвалі, як добра працуе. Тады заробкі на ёй былі аднымі з найбольшых у Маладачанскім раёне. Але ў хуткім часе вытворчасьць кардону зрабілася нерэнтабельнай, запазычанасьць прадпрыемства перавысіла некалькі мільярдаў рублёў. Вось і спынілі фабрыку. Сярэдняя дапамога для тых, хто стаіць на біржы працы, складае 40 тысячаў рублёў у месяц. Увосень ад біржы езьдзілі ў калгас, зараблялі за дзень паўвядра бульбы ці пару качаноў капусты. Гэтай вясной павезьлі ў лес. Аднавяскоўцы за тыдзень засадзілі патрэбны ўчастак. Лясьнічы потым «абураўся»: «Што ж я з вамі буду рабіць? Гэта ж плянавалася на месяц працы!»

Мужчыны зьбягаюць у Чысьць, Маладэчна, на шматлікія тартакі, што распладзіліся навокал. Заробак у 150 тысяч лічыцца вельмі прыстойным, а сярэдні заробак па краіне — 150 даляраў — здаецца шалёным.

Вяскоўцы ў нейкай паняверцы. Якія там парлямэнцкія выбары, калі ніхто не зьвяртае на гэтых людзей увагі — ні камуністы, ні дэмакраты, ні афіцыйныя ўлады. Куды толькі ні пісалі і ні тэлефанавалі — ад «Советской Белоруссии» і «Народнай волі» аж но да канцылярыі Тозіка ды АНТ. Толькі што пры канцы сьнежня прыяжджала Сталічнае тэлебачаньне — паказвала гаротнае становішча фабрыкі і людзей. Але выніку ад гэтага сюжэту ніякага.

Усе надзеі… на Лукашэнку. Людзі вераць у цуд. Езьдзіць жа па рэгіёнах — можа, адведае і Маладачаншчыну, а там раптам завітае і ў Раёўку ды валявым рашэньнем навядзе парадак.

**Алег Раявец, Раёўка—Менск**

## Звольнены настаўнік

Настаўнік фізкультуры СШ №3 г.Івацэвічы Ўладзімер Шмачын заўважыў, што шасьцікляснік Антон Антановіч кінуў на спартыўнай пляцоўцы паперку. Сказаў падабраць. Падлетак паслухаўся. Калі настаўнік адвярнуўся, пачуўся рогат. Паперка зноў ляжала на зямлі. На гэты раз хлопчык адмовіўся яе падбіраць: «Я яе ня кідаў». Тады У.Шмачын схапіў вучня за каўнер і, паводле сваіх слоў, нахіліў уніз, а паводле слоў пацярпелага, штурхнуў яго. Шасьцікласьнік, які трымаў рукі ў кішэнях, не ўтрымаўся, страціў раўнавагу і ўпаў тварам на асфальт. Акрываўленага хлапчука настаўнік завёў у разьдзявалку, абмыў твар. А ўвечары бацькі адвезьлі Антона ў траўматалягічнае аддзяленьне бальніцы, дзе яму давялося правалявацца больш за тыдзень. Вынік падзеньня — закрытая чэрапна-мазгавая траўма са страсеньнем мазгоў.

Дырэкцыя адной зь перадавых школ раёну адрэагавала на гэты факт хутка. Настаўнік У.Шмачын звольнены за амаральны ўчынак, несумяшчальны з пэдагагічнай дзейнасьцю. Такі зроблены запіс у працоўнай кніжцы. Кар'ера прыхільніка «чысьціні й парадку на зямлі» пайшла марна.

**Алесь Лаўранюк, Івацэвічы**

## Шапікі без цыгарэт

Усе шапікі, што належаць прадпрымальнікам гораду, з 1 чэрвеня спынілі продаж цыгарэт. Малы бізнэс тым самым выказаў сваю нязгоду з высокімі стаўкамі падаткаў, устаноўленымі рашэньнем гарадзкіх уладаў яшчэ ў лютым 2004 году. Згодна зь ім, кожная «кропка», што гандлюе тытунём, абавязана плаціць дадаткова штомесячны збор 7,5 базавай велічыні, або 142,5 тыс. руб. Між тым цыгарэты давалі амаль палову ўсёй выручкі «сярэднестатыстычнага» шапіку. Прадстаўнік Саюзу прадпрымальнікаў А.Самусевіч лічыць, што ў мясцовай улады няма аб'ектыўнай неабходнасьці перавышаць традыцыйны 5%-ны падатак ад прыбытку.

## Забіваюць свой свайго

Рэдкі тыдзень абыходзіца без таго, каб у гарадзкую больніцу «хуткая» не даставіла чалавека зь небясьпечнымі для жыцьця раненьнямі, атрыманымі ад родзічаў на «бытавой глебе», нападзіту. Так, мэдсястра В. 1975 г. нар., якая працавала ў гэтай бальніцы, атрымала дома ўдар вытрыёмм нажоўкі ў шыю ад п'янага мужа. А 72-гадовы пэнсіянэр М. адмовіўся выкладваць грошы са сваёй мізэрнай пэнсіі п'янаму ўнуку, што за тыдзень да таго вярнуўся з турмы. Разьюшаны ўнук ударыў дзядулю сякерай па галаве. Небаракі абое сканалі ў рэанімацыі.

## Грымяць выбухі за Жыліным Бродам

Сем гадоў таму на складах захоўваньня артылерыйскіх снарадаў на тэрыторыі жылінбродзкага лясьніцтва паблізу аднайменнай вёскі адбыўся страшэнны сілы выбух. З тэхнічнай тэрыторыі ў 69 га, дзе захоўваліся снарады, сотні тысяч іх разьляцеліся ад выбуху на плошчу ў 230 га, а дробнакалібэрныя — і далей. Таму ўжо сем гадоў сапёры з цэнтру ўтылізацыі боепрыпасаў і ракет займаюцца пошукам небясьпечных выбуховых прыстасаваньняў. Імі ўжо зьнішчана каля 140 тысяч снарадаў ды мінаў, у тым ліку за травень сёлетняга году — звыш за 500. З улікам таго, што радыюс разьлёту асколкаў буйнакалібэрных снарадаў і мін пры падрыве даходзіць да трох кілямэтраў, усе падыходы да небясьпечнай зоны кантралююцца, асабліва ў пэрыяд збору ягад і грыбоў, якіх у тутэйшых лясах нямала.

**Міхась Кутнявецкі, Слуцак**

## Падарункі ад Марачкіна

11 чэрвеня ў Полацкай галерэі адбылося адкрыцьцё выставы жывапісу Аляксея Марачкіна і скульптуры Алеся Шатэрніка. Горад наведала прадстаўнічая дэлегацыя дзеячоў культуры. Сярод іх — кінарэжысэр Уладзімер Арлоў, скульптар Аляксандар Фінскі. Аляксей Марачкін у падарунак музэю перадаў дзьве мастацкія працы: сваю і А.Пятрухны — пакуль малавядомага, але, як запэўніў Марачкін, вельмі таленавітага і неардынарнага мастака. Дарэчы, А.Шатэрнік зьяўляецца аўтарам помніка заснавальнікам Полацку — крывічам, які стаіць ля Полацкай галерэі.

## Спакусіўся на блешню

Палачаніну Эдуарду Гаўрылаву пашчасьціла: у Дзьвіне побач з чыгуначным мостам ён злавіў 41-кіляграмовага сама. Даўжыня рыбіны — 180 см. Сом злавіўся на блешню. Шчасьлівчык, былы дэсантнік, супрацоўнік полацкай «Аховы», выцягваў рачнога драпежніка паўтары гадзіны.

**Васіль Крoква, Полацак**

## Актывіста здаў вэтэран

Горацкая раённая адміністрацыйная камісія прысудзіла актывісту мясцовага «Клюбу выбарцаў» Дзям'яну Франкоўскаму штраф за распаўсюджваньне ўлётак «Пяцёркі+». Падставай паслужыла скарга старшыні горацкага Саюзу вэтэранаў сп.Маркоўскага. Ён папрасіў міліцыянтаў разабрацца зь дзейнасьцю мясцовай моладзі, якая раздае матэрыялы «5+», і прыклаў сабраныя ім улёткі. Акрамя таго, сп.Маркоўскі праявіў зайздросную інфармаванасьць, дакладна назваўшы каардынатара кампаніі ў Горках — Дз.Франкоўскага. Адміністрацыйная камісія доўга не магла вырашыць, за што даваць штраф актывісту. Яе члены спрабавалі абвінаваціць сп.Франкоўскага хто ў чым: «У некага нават была думка, што ўлёткі зьмяшчаюць «антыканстытуцыйныя дзеяньні», бо крытыкуюць кантрактную сыстэму», — расказвае сп.Франкоўскі. У выніку пастанавілі спагнаць з абвінавачванага штраф — адну базавую велічыню за парушэньне парадку распаўсюджваньня друкаванак.

**Ягор Клішэвіч,belngo.info**

## У гонар Пэна

У Віцебску пачаліся сьвяткаваньні 150-годзьдзя з дня нараджэньня Юдэля Пэна, заснавальніка першай у Віцебску школы маляваньня і жывапісу, настаўніка Шагала. Прайшлі навуковыя чытаньні. Акторы коласаўскага тэатру прэзэнтавалі новы спэктакль «Ружа ў чыстым полі», прысьвечаны Пэнаваму жыцьцю. У краязнаўчым музэі адкрылася экспазыцыя палотнаў мастака. А краязнаўчы фонд імя Сапунова ды гарадзкая габрэйская грамада прэзэнтавалі другі выпуск «Шагаловского международного ежегодника».

**Вітальд Гамбровіч, belngo.info**

# Родныя дзеці Андропава

Аляксандар Фядута

**Заканчэньне. Пачатак у №21, 22.**

Вядома, чаяваньні скончыліся, як толькі я звольніўся з Адміністрацыі. Гэта мяне не зьдзівіла, бо я зразумеў, што ў дадатак да несумненнага розуму Бог узнагародзіў майго візаві з Рады бясьпекі яшчэ й асьцярожнасьцю. Хоць, можа быць, гэта таксама было прафэсійным. Асабістыя адносіны — асабістымі адносінамі, але рызыкаваць ня трэба. Звольніўся чалавек — ну й добра. Пры сустрэчы можна раскланяцца і нават паразмаўляць. Але калі, да прыкладу, я зьвярнуўся да Анатоля Тозіка пасьля ягонага прызначэньня ў 1995 г. на пасаду намесьніка дзяржсакратара Рады бясьпекі (Шэйман уважаў Тозіка за свайго чалавека і быў перакананы, што новы намесьнік ня стане яго падседжваць) з просьбай пра інтэрвію, мне ветліва адмовілі. Тозік сказаў, што гэтае пытаньне трэба ўзгадніць зь ягоным непасрэдным начальствам. Я, праўда, ня пэўны, ці дакладваў ён пра гэта Шэйману, ці гэта была звыклая форма ўхіленьня ад адказнасьці. У кожным разе, асуджаць Тозіка за гэта ня варта. Прынамсі, я не асуджаю.

У апараце Рады бясьпекі Анатоль Апанасавіч па-ранейшаму курыраваў аналітычныя структуры. Менавіта ў пэрыяд ягонага куратарства распрацавалі й правялі акцыю, вядомую як рэфэрэндум 1996 г. Я ня ўпэўнены, што Тозік удзельнічаў у прыняцьці рашэньня аб яго правядзеньні, але тое, што менавіта ён забясьпечваў яго аналітычна, у мяне не выклікае ніякіх сумненьняў. Гэта было ягоным абавязкам паводле пасады. Прычым выконваў ён сваю работу з абсалютным спакоем, паколькі палітычная адказнасьць за тое, што адбывалася ў краіне, ляжала не на ім. І ён гэта ведаў. Дзяржаўным службоўцам увогуле прыемна асэнсоўваць, што палітычная адказнасьць за прыняцьце рашэньня і яго рэалізацыю ляжыць на ўсенародна абраным кіраўніку дзяржавы.

Хоць, мабыць, пра маральны бок таго, што адбывалася, ён задумляўся і тады. Я памятаю, як мы сустрэліся з Анатолем Апанасавічам пасьля трохгадовага перапынку у 1997 г. Я вяртаўся цягніком з Масквы, і за тры хвіліны да яго адыходу ў маё пустое купэ ўвайшлі два супрацоўнікі Саўбезу і — Тозік. Мабыць, у той момант ён шчыра ўзрадаваўся. Я, праўду кажучы, таксама. Усё-такі дарога доўгая, і знаёмы спадарожнік лепшы, чым пустата. Мы выпілі, як і належыць чатыром мужыкам у купэ, і разгаварыліся. Тозікавы спадарожнікі спрабавалі мяне пад'юджваць: ну як так, быў у камандзе прэзыдэнта і раптам сышоў у апазыцыйную прэсу? Хіба гэта маральна? Давялося адказваць. У якасьці сустрэчнага прыкладу я прывёў лёс Юры Малумава: прэзыдэнт двойчы быў яму абавязаны — за выбары 1994 г. і за зрыў імпічмэнту 1996 г. А замест падзякі — ашальмаванага і зганьбаванага Малумава выціснулі з палітыкі і нават публічна не папрасілі прабачэньня. Мае суразмоўнікі спрабавалі чымсьці пярэчыць, але Тозік, які маўчаў, раптам адрэзаў: «Кіньце! Вы ж ведаеце, што ён праўду кажа». Ён не асуджаў прэзыдэнта — але ён і не адмаўляў зусім відавочных рэчаў, гэта значыць не рабіў яўнага глупства. І тады я зразумеў, што мае першыя ўражаньні 1994 г. мяне не ашукалі. Мала хто з чыноўнікаў вышэйшага эшалёну так рэзка абарве «шасьцёрак», якія спрабуюць яму дагадзіць, і прадэманструе такую якасьць, як справядлівасьць.

І мае чытачы, і мае калегі пачнуць пярэчыць: што ж робіць прыстойны чалавек сёньня там, у гэтай уладзе? Чаму ён не сышоў зь яе? Дазволю сабе выказаць адну вэрсію. У няпісаным кодэксе гонару Анатоля Тозіка ёсьць адзін сур'ёзны параграф. У гэтым параграфе вызначаецца мера асабістай адказнасьці за тое, што адбываецца. Асабіста я працую ў інтарэсах дзяржавы ці не? У інтарэсах дзяржавы. Мае пачуцьце ўласнай годнасьці зьняважана? Не. Значыць, я магу працаваць і далей. (Лёсу Станіслава Князева, які пайшоў на службу да Лукашэнкі пасьля публічнага паніжэньня ў званьні, Тозік не паўтарыў бы ніколі: ён занадта сябе для гэтага паважае.) Я не задаюся пытаньнем пра тое, наколькі доўга дзяржаўны службовец можа працаваць у такіх шорах, але што Тозік разважаў менавіта гэтак у 1994 і ў 1996 г. — за гэта я ручаюся. Ня выключана, што гэтак ён разважае і дасюль.

Я думаю, менавіта якасьці дзяржаўніка ў спалучэньні са звычкамі кадравага аналітыка з КДБ і ўзьнесьлі Анатоля Тозіка на вяршыню беларускага палітычнага Алімпу. Часам Аляксандар Лукашэнка разумее, што патрэбны ня толькі ланцужныя сабакі з *асабістай адданасьцю*, але яшчэ й дзяржаўнікі, на *асабістую прыстойнасьць* якіх можна паспадзявацца.

Калі Тозіка прызначалі старшынём Камітэту дзяржаўнага кантролю, усе ўжо добра разумелі, што пры жаданьні можна зрабіць з гэтай структуры. Былі прыклады.

Спачатку Службу кантролю прэзыдэнта (так яна называлася) узначальваў Васіль Даўгалёў. Даўгалёву наагул уласьціва было ў тыя часы нейкае асаблівае баламуцтва, заўзятасьць і імпэт у выкананьні службовага абавязку. Яго ведамства кідалася на навакольных з радасьцю шчанюка аўчаркі, якога прымусілі разыгрываць ролю сабакі Баскервіляў. Доўга Даўгалёў на гэтым месцы ўтрымацца ня змог, паколькі пасьпеў моцна пасварыцца з Малумавым — тады галоўным антыкарупцыянэрам у Адміністрацыі. Як Малумаў спрацаваў, я ня ведаю, але разам з сыходам ва ўрад Леаніда Сініцына туды ж «сышлі» і Даўгалёва. А ягонае месца заняў Мікалай Дамашкевіч.

Дамашкевіч і стварыў тое ведамства страху, якое атрымала назву КДК. Цяпер менскі губэрнатар крыўдуе, калі гавораць ці пішуць, што ў КДК пры Дамашкевічу прымаліся палітызаваныя рашэньні. На самай справе, вядома, ягоная праўда: рашэньняў такога роду не было ўвогуле. Бо нельга ж лічыць палітызаваным рашэньне накіроўваць на праверку незалежнага выданьня чыноўнікаў КДК? Нельга, вядома. Нават калі яны правяраюць яго на працягу месяца, а пасьля гэтага прыходзіць новая праверка — і таксама з КДК, толькі іншага ўзроўню. І празь месяц усё паўтараецца, і працаваць немагчыма, бо ніхто ў бухгальтэрыі не разумее, што шукаюць, — але ж вось шукаюць — і ўсё! І так адбывалася ня толькі ў прыватных газэтах, але і ў прыватных фірмах, прычым нават у тых, якія ніколі не працавалі зь бюджэтнымі грашыма. Пры Дамашкевічу КДК працаваў як танк, што не даваў працаваць усім астатнім. Кажуць нават, што Мікалай Фёдаравіч — неўзабаве пасьля гібелі Мікалуцкага — ледзьве не прасіў прэзыдэнта назначыць яго прэм'ерам: маўляў, інакш і яго заб'юць.

Дамашкевіча зьмяніў Андрэй Кабякоў. Былы мэнэджэр сярэдняга зьвяна рагачоўскага заводу «Дыяпраектар» быў у свой час выцягнуты адтуль Даўгалёвым, які прабіўся на самы верх улады. І ў КДК, адкуль яго прыбраў Дамашкевіч і куды яго вярнулі замест Дамашкевіча, ён выконваў своеасаблівую функцыю запчасткі Даўгалёва. Палітычна ён быў безаблічны, функцыянальна ён спрабаваў працаваць у рамках закону і пасьля знаходжаньня на гэтым месцы — гэта пасьля Дамашкевіча! — не пакінуў ні добрай, ні злой славы. Яго зноў выцягнулі з кабінэту і зноў паставілі замест Даўгалёва — гэтым разам ва ўрад, бо трэба некаму і ва ўрадзе працаваць Даўгалёвым.

А ў КДК — вытрымаўшы паўзу — паставілі Тозіка. <...> І трэба сказаць, што назначэньне Тозіка было ці ня самым удалым кадравым рашэньнем Лукашэнкі пасьля 1999 г.

Па-першае, Тозік ніколі не працаваў з камэрцыйнымі структурамі і ня браў хабару. З гэтага пункту гледжаньня ён быў і, кажуць, застаецца крыштальна чысты (зрэшты, асобныя дэпутаты парлямэнту сёньня трымаюцца іншай думкі). А тое, што на розных узроўнях КДК пасьпеў прагнісьці, было зразумела ўжо даўно. Па-другое, Анатоль Апанасавіч быў і застаецца законьнікам. Так сказаць, Понцкі Пілат, вымушаны выконваць рашэньні сынэдрыёну. Выявілі што-небудзь — пакараем, не — жывіце спакойна. Гэта было трэба яшчэ і таму, што к моманту назначэньня Тозіка зьмянілася асноўная мішэнь, па якой належала весьці страляніну КДК. Калі раней душылі пераважна прыватны бізнэс, дык цяпер гарматы былі скіраваны на дзяржаўныя прадпрыемствы і чыноўнікаў. Палкоўнік КДБ, які ўсё жыцьцё займаўся аналітыкай, у тым ліку і эканамічнай (зрэдку), ня меў дастатковых сувязяў у дзяржапараце, каб пасьпець прасякнуцца карупцыяй ці быць асабіста зацікаўленым ва ўкрываньні ад прэзыдэнта таго ці іншага кампрамату на ўладу і дырэктарат.

Да таго ж, быў і яшчэ адзін немалаважны момант. Тозік умудрыўся застацца ўбаку ад унутрыкланавай барацьбы ў лукашэнкаўскім акружэньні. Не, зразумела, ва ўладу яго прывёў Шэйман, і Тозік пра гэта помніў і помніць. Але ў яго заўсёды былі цудоўныя асабістыя стасункі з Латыпавым — з часоў Вышэйшай школы КДБ, — дык навошта ж іх псаваць? Анатоль Апанасавіч іх і не псаваў. Ён ня быў зьвязаны ні з Заматаліным, ні зь Мясьніковічам, ні зь Ціцянковым, ні з Канаплёвым. Вось такі чалавек і быў патрэбен на гэтай пасадзе.

Апроч таго, ён пасьпеў давесьці сваю асабістую бесстароннасьць і аб'ектыўнасьць. Калі ўвесну 1999 г. Уладзімер Мацкевіч — тады ўсё яшчэ старшыня КДБ — напісаў запіску на імя кіраўніка дзяржавы пра катастрафічнае становішча ў эканоміцы, правяраць яе накіравалі Шэйману. Прэзыдэнт наагул любіць накіроўваць вашы запіскі вашым асабістым апанэнтам — для праверкі ці да ведама. Пра нічога ня вартыя адносіны Шэймана і Мацкевіча ў гэты пэрыяд ня ведаў толькі поўны ідыёт. Тозік ідыётам ня быў. Але ён ня быў і нягоднікам. Таму пасьля таго, як яму накіравалі на рэцэнзію Мацкевічаву запіску, Тозік напісаў праўду. Ён пацьвердзіў справядлівасьць высноў шэфа КДБ, давёўшы сваю бестароннасьць.




**Калегі Анатоль Тозік і Сяргей Сьцяпашын пасьля сумеснага паседжаньня.**

Латыпаў і Тозік займелі ў Лукашэнку свайго Андропава. Толькі значна маладзейшага, а таму здольнага даць ім тэрмін, дастатковы для рэалізацыі кадэбісцкай утопіі.

…І апынуўся ў патрэбным месцы ў патрэбны час. Тут пайшло на карысьць усё. І асьцярожнасьць: дзейнічаць трэба строга паводле закону, каб не падставіцца самому. І ўменьне быць цьвёрдым і патрабавальным. І спакой, які мяжуе з паталёгіяй: калі хто-небудзь бачыў Тозіка, які нэрваваўся, раскажыце, калі ласка, як гэта выглядае. І, нарэшце, адсутнасьць страху. <...>

Над дзяржавай навіс цень невысокага чалавека зь ціхім голасам і цяжкім прафэсійным поглядам. Паспрабуйце крануцца зь месца, сунуць руку ў кішэнь, дастаць адтуль «баранчыка ў паперцы» — ці ўзяць гэтага самага баранчыка, калі ў вас ёсьць адчуваньне, што за вамі сочаць! Не, гэта ня значыць, што ўвогуле кантралёры раптам перасталі браць хабар. Але браць сталі значна радзей. І значна болей. <...>

Можна з упэўненасьцю сказаць, што КДК ператвараўся менавіта ў тую структуру, якую пажадаў зь яго зрабіць прэзыдэнт. Тозікава ведамства стала бесстаронным караючым мячом. Спытайце любога дырэктара, і ён пацьвердзіць: спачатку прыходзяць кантралёры, за імі — пракуроры. Работа апошніх максымальна аблегчана. Паколькі парушэньні ёсьць на любым буйным прадпрыемстве, кантралёр іх знаходзіць дастаткова хутка. І дакладвае адносна начальства. Пракуратуры, якая атрымала ўсю неабходную інфармацыю, застаецца толькі вызначыць артыкул і меру стрыманьня. Менавіта гэтая ведамасная зьвязка выклікае сёньня такі дзікі і шчыры страх у чыноўнікаў і дырэктараў. <...>

Можна сказаць, што Латыпаў і Тозік займелі ў Лукашэнку свайго Андропава. Толькі значна маладзейшага, а таму здольнага даць ім тэрмін, дастатковы для рэалізацыі кадэбісцкай утопіі. Ён бы ім нават катлаван на ўзор платонаўскага дазволіў выкапаць, калі б гэта ўкладалася ў ягоныя перакананьні і ягоныя ўяўленьні аб сьвеце. А яны неадкладна ўзялі б пад казырок і пайшлі б выконваць яго загад — капаць катлаван!

І вось гэта і было заганай сыстэмы. Бо камуністычная сыстэма з горам папалам была здольна на самаўзнаўленьне — бо стрыжнем яе была камуністычная ідэалёгія, вера ў сьветлую будучыню, якая межавала з амаль рэлігійнай, фанатычна апантанай верай у Валадарства Нябеснае. Ва ўмовах жа, калі Валадарства Нябеснае заведама прызнаецца мэтай недасяжнай, сэнс пакут і ліхтуг цэлага народу зьнікае. Дзеля чаго? Дзеля чаго трываць бясконцыя праверкі КДК, бясконцы рост цэнаў?

Да 2003 г., да пачатку газавых войнаў з Расеяй, сэнс — гэта значыць выразна артыкуляваная і нібыта дасягальная мэта — усё-такі быў. Народу казалі: «Дараженькі, пацярпі! Яшчэ год-другі, і мы аб'яднаемся з краінай, у якой малочныя рэкі цякуць у кісельных берагах, а алігархі добраахвотна аддаюць грошы дзеля падтрымкі пэнсіянэраў!» Дзеля гэтага прапаноўвалася праклясьці апазыцыю, згадзіцца на бясконцую пралянгацыю прэзыдэнцкіх паўнамоцтваў Лукашэнкі і адмовіцца ад шмат якіх прымет дзяржаўнага сувэрэнітэту — напрыклад ад нацыянальнай валюты. Газавы крызыс прадэманстраваў: ніякага аб'яднаньня на ўмовах, якія б задавальнялі беларускую эліту (гэта значыць асабіста Аляксандра Лукашэнку), ужо ніколі ня будзе. Трываць усё, што адбываецца, і далей — дзеля чаго?!

І паколькі новая бясконцая мэта сфармулявана не была, зрабілася зразумелым, што немагчыма забясьпечыць самаўзнаўленьне сыстэмы дзяржаўнага кіраваньня па сканчэньні паўнамоцтваў Аляксандра Лукашэнкі. Як ніколі востра паўстала пытаньне пра пераемнасьць улады.

Вастрыня яго была абумоўлена ня столькі пытаньнем пра будучыню Лукашэнкі, колькі пытаньнем пра іхную будучыню. Яны занадта зблізіліся з прэзыдэнтам, занадта блізка падышлі да цмока, каб не апячыся агнём зь ягонай пашчы. Ён быў гарантам для іх — як для выканаўцаў яго волі, выканаўцаў бесьпярэчных. Цяпер яны гатовы былі ўзяць на сябе ролю гарантаў ягонай бясьпекі. І нават былі гатовы стрымаць дадзенае яму слова любой цаной.

Але для гэтага Лукашэнку трэба было нарэшце згадзіцца з тым, што ўлада ўсё-такі пяройдзе ў чужыя рукі.

Да гэтага Аляксандар Рыгоравіч гатовы ня быў.

**«НН» пазнаёміла вас з урыўкам з кнігі Аляксандра Фядуты «Аляксандар Лукашэнка. Ягоны час, ягоны народ», якая выйдзе ў лістападзе бягучага году.**

# Быкаў у Празе

рэмінісцэнцыя

Віталь Тарас

Гэта не ўспамін. Год — занадта малы тэрмін, каб канчаткова звыкнуцца з думкаю, што Быкава больш няма і што гаварыць аб ім трэба ў мінулым часе. Дый увогуле, гэта толькі лічыцца, што мэмуары пішуцца, каб пакінуць нашчадкам праўду аб падзеях ці асобах. Часьцей за ўсё, сьвядома ці падсьвядома, аўтар успамінаў зьвяртаецца да сваіх сучасьнікаў. Таму даведваемся мы з успамінаў больш не пра тых, каму яны прысьвечаныя, а пра таго, хто іх пісаў. І тут ужо ўсё залежыць ад маштабу асобы аўтара. Чым меншы маштаб — тым болей на першы плян выходзяць эгаістычныя мэты альбо інтарэсы асобных партыяў ці груповак.

Ёсьць і яшчэ адна акалічнасьць, якая не дазваляе называць гэтыя нататкі ўспамінам. У тыя некалькі тыдняў, цягам якіх давялося больш-менш часта й шчыльна кантактаваць з Васілём Быкавым у Празе, я не рабіў ніякіх запісаў — нават на паперы. (Застаўся толькі відэазапіс, зроблены падчас прагулкі Быкава ў каралеўскім парку «Стромаўка».) Напэўна, гэта была памылка. Але, паколькі я ведаў ужо тады аб характары хваробы пісьменьніка, мяне чамусьці перасьледавала прымхлівае пачуцьцё, што занатоўваць словы Быкава на будучыню, «для гісторыі» — значыць нейкім чынам «выкарыстоўваць момант» і тым самым, міжволі, думаць не аб жыцьці, але аб сьмерці, як бы прысьпешваць яе.

У кожным выпадку, не прэтэндую на дакумэнтальнае апісаньне апошніх дзён перабываньня Быкава на чужыне. Пра гэтыя дні не аднойчы пісалі ўжо і яшчэ не аднойчы, пэўна, напішуць журналісты беларускай рэдакцыі радыё «Свабода». Частка матэрыялаў, датычных таго пэрыяду, знайшла адлюстраваньне ў кнізе «Быкаў на «Свабодзе». Пра той пэрыяд ёсьць успаміны майго бацькі — Валянціна Тараса, якія, спадзяюся, хутка будуць апублікаваныя.

Трэба зазначыць, што да вясны 2003-га году мне даводзілася разам зь іншымі супрацоўнікамі радыё сустракацца з Быкавым усяго некалькі разоў. У асноўным гэта тычылася творчых абавязкаў. Але ў тую вясну воляю абставінаў здарылася так, што нам з жонкаю пашчасьціла некалькі разоў дапамагаць Васілю Быкаву і ягонай жонцы Ірыне ў вырашэньні некаторых побытавых і мэдычных праблемаў. (Калі я кажу «нам», дык прыпадабняюся да пэрсанажа вядомай байкі, які казаў: «Мы аралі». Бо насамрэч усімі практычнымі справамі займалася мая жонка Алена, а я толькі прысутнічаў пры гэтым ці выкарыстоўваўся ў якасьці насільшчыка).

Ізноў жа, не хачу й ня маю права апісваць гісторыю хваробы пісьменьніка ці яе фізіялягічныя праявы. Магу толькі засьведчыць выключную мужнасьць Васіля Быкава. Пры гэтым ягоны стаіцызм ня меў нічога супольнага зь нейкай позай альбо патасам. Як і ягоныя літаратурныя героі, ён быў абсалютна пазбаўлены чагосьці напускнога, разьлічанага на публіку.

За некалькі дзён перад тым, як легчы ў шпіталь на апэрацыю, Васіль Быкаў з жонкай запрасіў нас — майго бацьку, зь якім даўно сябраваў, а таксама мяне з маёй жонкай — павячэраць. Ён прапанаваў нам самім выбраць рэстарацыю, за сталом увесь час настойваў, каб мы выбіралі тое, што нам найбольш падабаецца. Сам ён у той вечар еў у сваё задавальненьне, піў піва, якое яму лекары апошнім часам піць забаранялі, дый ня толькі піва. Спадарыня Быкава, натуральна, была гэтым вельмі ўстрывожаная, увесь час спрабавала спыніць гэткае злоснае парушэньне рэжыму. Быкаў тыя спробы рашуча спыняў. Рабіў ён гэта зь мяккай усьмешкай на твары, але досыць жорстка. Увогуле, пры больш блізкім знаёмстве рабілася ясна, наколькі няпросты быў гэты чалавек у побыце. За мяккасьцю ды інтэлігентнасьцю нярэдка хавалася ўпартасьць, нежаданьне саступаць першым, часам нават капрызьлівасьць. Несумненна, свой адбітак на яго накладала тады ўжо цяжкая хвароба.

Але ў той вечар, хоць пакута й смуга чыталіся недзе ў глыбіні быкаўскіх вачэй, у нейкай амаль незаўважнай запаволенасьці ягоных рухаў, сьмяяўся й жартаваў ён зусім шчыра. Было відаць, што ў Празе яму вельмі не хапае, акрамя іншага, звычайнага нефармальнага застольля, у якім можна разьняволіцца й крышку расслабіцца, пабыць самім сабой. Пасьля таго застольля здарылася тое, чаго баялася жонка, — у Быкава ўначы быў прыступ, у чым ускосна былі вінаватыя, безумоўна, і мы. Але ж такім ажыўленым і, можна сказаць, лёгкім, як пры апошнім разьвітаньні (так яму тады здавалася) зь сябром маладосьці ды ягонымі сваякамі я Быкава ні перад тым, ні пасьля таго ня бачыў.

Адчувалася (ці, можа, так здавалася), што Быкаў быў трошкі абцяжараны заўсёдным стаўленьнем да яго ў Празе з боку суайчыньнікаў як да жывога клясыка, карыфэя прозы, героя беларускага адраджэньня ды яшчэ мудрага філёзафа. Пры гэтым, як часта бывае, вонкавыя знакі пашаны, на жаль, у некаторых спалучаліся з адсутнасьцю такту й жаданьня ахвяраваць уласным часам. Гэтая акалічнасьць, а таксама прыродная сьціпласьць Быкава заміналі яму гаварыць аб рэчах сапраўды празаічных. Напрыклад, жыць яму давялося ў зусім маленькай кватэрцы, якую вылучыў Быкавым магістрат Прагі пры дапамозе чэскай праваабарончай арганізацыі «Чалавек у бядоце». Гэта для суайчыньнікаў ці, скажам, для экс-прэзыдэнта Чэхіі Гавала Быкаў быў жывы клясык, а для чэскіх уладаў ён быў усяго толькі іміґрант, які прыехаў з адной з краінаў былога СССР, — пэнсіянэр, якіх у Чэхіі без таго хапае.

У аднапакаёвай кватэрцы, куды ўехалі Быкавы, перад тым зрабілі касмэтычны рамонт, але скрозь сьвежую пабелку дзе-ні-дзе адразу ж праступілі ржавыя пісягі ад шматлікіх працяканьняў трубаў дапатопнае каналізацыі. У акно першага паверху былі відаць панэльны будынак на процілеглым баку вуліцы й каляровыя кантэйнэры для сьмецьця, заўсёды перапоўненыя. Вось такі краявід з «кабінэту» пісьменьніка. Абстаноўка ў пакоі была зусім спартанская, пакуль Быкаў сам сабе не купіў працоўны стол, лямпу й канапу. Відаць з усяго, ён рыхтаваўся, нягледзячы ні на што, жыць і працаваць тут. Ані разу ні ад Быкава, ні ад яго жонкі мы ня чулі нараканьняў ні на якасьць жытла, ні на тое, што дабірацца ў цэнтар Прагі й назад на трамваі даволі доўга й цяжка, ці на нейкія іншыя побытавыя праблемы.



АРХІЎ ВАЛЯНЦІНЫ ТАРАСА

**За мяккасьцю ды інтэлігентнасьцю гэтага стоіка хавалася незвычайная ўпартасьць. Ён таксама няспынна аналізаваў сябе — свае ўчынкі, свае словы. Ён бываў вельмі розным — у застольлі, у прэзыдыюме, у сям'і, зь сябрамі. На фота — з жонкай Ірынай і Аленай Лукашэвіч у Празе.**

У адным з рэпартажаў на «Свабодзе», яшчэ пры жыцьці Быкава, падрабязна апісваўся рабочы стол пісьменьніка, рэчы, якія засталіся ляжаць на ім, газэты, рукапісы, дакумэнты — так, як бы пісьменьніка ўжо ня стала. Але ж і ў той няўтульнай кватэрцы заставалася й застаецца цяпер часьцінка яго душы, часьцінка біяграфіі. Ня ведаю, хто жыве цяпер пад адрасам Вршовіцкага Надражы, 22... Ня ведаю таксама, ці павесяць калі-небудзь на тым доме шыльду «Тут жыў вялікі беларускі пісьменьнік Васіль Быкаў». У гэты раён Прагі турысты рэдка заяжджаюць...

Пасьля апэрацыі Быкаў на некаторы час вярнуўся ў кватэрку.

Пісаць ён ня мог, бо быў зусім зьнясілены, ляжаў увесь час на канапе, але ўвесь час чытаў і прасіў прыносіць кнігі. Адной зь іх была невялічкая кніжка Ўладзімера Вайновіча пра Салжаніцына. Салжаніцына Быкаў ня вельмі любіў, але й пра кніжку Вайновіча, дзе той моцна спляжыў расейскага «прарока», адазваўся ня надта прыязна, убачыўшы ў ёй, найперш, падсумаваньне нейкіх асабістых рахункаў паміж двума пісьменьнікамі.

Прынесьлі мы Быкавым і некалькі відэакасэтаў. Фільму Сакурава «Малох» пра Гітлера Быкаў глядзець ня стаў — яму адразу не спадабалася творчая манера рэжысэра. А вось дакумэнтальная стужкі — сярод іх фільм «Ля вытокаў авангарду», прысьвечаны Шагалу, — паглядзеў зь цікавасьцю. Па тэлевізіі часьцей за ўсё Быкаў глядзеў навіны на чэскіх каналах.

Адна з апошніх нашых сустрэч перад адлётам Быкавых у Менск адбылася на Бабе, што на Ганспальцы, падчас прагулкі. Ёсьць такі прыгожы раён у Празе — на ўзвышшы над Ултавай, адкуль адкрываецца цудоўны краявід. Падчас гэтых прагулак заўсёды гаварыў Быкаў, калі адчуваў сябе больш-менш нармальна. Я толькі слухаў. Выключэньнем была толькі тэма вайны ў Іраку, якой Быкаў вельмі цікавіўся і распытваў у мяне пра ўсё, што я на той момант на гэтую тэму ведаў. Пры гэтым ён не даваў ніякіх, у тым ліку й маральных, ацэнак падзеяў. Аднак яшчэ да падзеньня Багдаду Быкаў выказваў поўную ўпэўненасьць у хуткаплыннасьці самой ваеннай апэрацыі, а таксама і ў хуткім падзеньні рэжыму Садама Хусэйна. Адносна цяперашняга рэжыму ў Беларусі Быкаў адзываўся значна больш пэсымістычна.

> Ён згадаў колішняе сваё інтэрвію адной італьянскай журналістцы, калі ён «прызнаўся», што ў гераіні аповесьці Джуліі быў рэальны прататып. «А ведаеце, не было прататыпу. Гэта цалкам прыдуманы пэрсанаж», — сказаў пісьменьнік з крыху сарамлівай усьмешкай.

Неяк, углядаючыся ў навакольны пэйзаж, Быкаў сказаў, што краявіды ў Чэхіі, як і ўвогуле ў Цэнтральнай Эўропе, выглядаюць больш лагоднымі, абжытымі й прыстасаванымі для чалавека, чым, скажам, у Беларусі. Ён назваў гэтыя пэйзажы «гуманістычнымі». Пагледзеўшы яшчэ раз на высокія пагоркі над Ултавай, Быкаў — мабыць, пад уплывам нейкай асацыяцыі — раптам загаварыў пра сваю «Альпійскую баляду». Ён згадаў колішняе сваё інтэрвію адной італьянскай журналістцы. У тым інтэрвію Быкаў «прызнаўся», што ў гераіні аповесьці Джуліі быў рэальны прататып у жыцьці. «А ведаеце, не было прататыпу. Гэта цалкам прыдуманы пэрсанаж», — сказаў пісьменьнік з сумнай, крыху сарамлівай усьмешкай. Быкаў даў зразумець, што яму тады проста захацелася зрабіць як бы нешта прыемнае для італьянцаў.

У гэтым нечаканым прызнаньні мне бачыцца ня толькі арганічнае для Быкава імкненьне гаварыць праўду, але ж і своеасаблівы спосаб давесьці, што праўда літаратуры вышэйшая за так званую «праўду жыцьця». Разуменьнем гэтай ісьціны, уласна кажучы, вялікі пісьменьнік адрозьніваецца ад проста таленавітага. Я думаю таксама, што ўнутры Васіля Быкава ў тыя дні, а мабыць, і да самой сьмерці, працягваўся паглыблены самааналіз. Безумоўна, ня ўсё, што хацелася яму сказаць, увайшло ў «Доўгую дарогу дадому». Будучы чалавекам цьвёрдых перакананьняў, ён, тым ня менш (а можа — менавіта таму), зноў і зноў вяртаўся да маральнай самаацэнкі сваіх учынкаў, сваёй творчасьці.

Адчувалася, што рашэньне ляцець у Менск далося Быкаву ня так проста. Нейкія маральныя акалічнасьці прыносілі яму ня менш, а ў нейкім сэнсе нават і больш пакутаў, чымся хвароба. Ня выключана, што нябачная сьвету ўнутраная душэўная барацьба з самім сабой паскорыла яе бег. Зрэшты, гэта толькі маё адвольнае дапушчэньне.

У кожным выпадку, на многія пытаньні мы ўжо ніколі, відаць, не атрымаем адказу. Чаму Быкаў апынуўся на эміграцыі менавіта ў Чэхіі? Наколькі быў падрыхтаваны пераезд у Прагу? Што сталася вырашальнай прычынай рашэньня Быкава ляцець пасьля апэрацыі ў Менск? Як надоўга ён ляцеў і ці сапраўды зьбіраўся вяртацца ў Прагу? Мабыць, сёньня гэта ўжо ня так і важна, як здавалася ўчора. Гэта, хутчэй, важна для гісторыкаў, для будучых біёграфаў Быкава.

Для сучасьнікаў больш важна зразумець, што Быкаў ужо не належыць нікому пэрсанальна. Ні прэзыдэнту, ні партыям, ні былым сябрам, ні нават сваякам і крэўным. Ён належыць усім беларусам — у тым ліку тым, хто пра яго ніколі ня чуў ці нават яшчэ не нарадзіўся. Ён належыць родным Бычкам, Менску, Беларусі, належыць таксама й Празе. Быкаў належыць чалавецтву.

# Год таму: як гэта было

**Гучыць каманда ўсім, апрача блізкіх, пакінуць памяшканьне. Мы з Барысом Пятровічам вырашаем не падпарадкоўвацца. Бачым, як каржакаватыя дзецюкі са спэцсувязьзю ў вушах блякуюць усе ўваходы й выхады. Салдаты здымаюць вечка з труны... Міхась Скобла, намесьнік старшыні Саюзу пісьменьнікаў, рэканструюе падзеі гадавое даўніны.**



ГЛЕБ ЛАБАДЗЕНКА

Тым летам у Бараўляны я езьдзіў часта: у анкалягічным шпіталі зь безнадзейным дыягназам ляжаў мой цесьць. Мінуўшы КПП са шлягбаўмам, наведнік нібы трапляў у іншы сьвет, дзе раптоўна зьнікалі ўсе жыцьцёвыя праблемы, дзе кожны незаўважна рабіўся экзыстэнцыялістам, узважваючы на шалях развагаў толькі два словы: жыцьцё й сьмерць. Felix opportunitate mortis. Шчасьлівы, хто памірае своечасова. Хацеў бы я павадзіць аўтара гэтага выслоўя па шматлюдных шпітальных калідорах, па падземных пераходах, па густа заселеных палатах, дзе паўсюль заўважалася й адчувалася адно — прага жыць. Не бывае сьмерці своечасовай.

У адзін са сваіх прыездаў я паведаміў цесьцю, што ў іхні шпіталь паклалі Васіля Быкава. Але ён пра гэта ўжо ведаў: пра Быкава нехта пачуў па радыё «Свабода» й расказаў у курылцы.

Навіна імгненна абляцела Бараўляны і, як мне падалося, узбадзёрыла хворых. Узбадзёрыла, бо нават невідочная прысутнасьць моцнага духам чалавека заўсёды падтрымлівае слабейшых.

22 чэрвеня а 9-й вечара — званок Алеся Пашкевіча. Васіль Быкаў памёр... Назаўтра з раніцы зьбіраемся ў Саюзе пісьменьнікаў, куды падыходзяць людзі, у тым ліку сын пісьменьніка Сяргей. Абгаворваюцца неабходныя ў падобных сытуацыях пытаньні: час пахаваньня, адпяваньне, катафалк... NN прапануе несьці труну да могілак на руках. Яму пярэчаць — Усходнія могілкі далёка, не данясём.

Па Доме літаратара ходзяць вайскоўцы (палкоўнікі й адзін генэрал), заглядаюць ва ўсе куткі. Потым зьбіраюцца на ганку й абмяркоўваюць, як *яны* будуць выносіць труну, як падгоняць катафалк ушчыльную да сходаў, як павязуць. Да Дому літаратара нагналі тэхнікі й рабочых — сьпешна кладуць асфальт, мяняюць бардзюры. У творцаў настрой змрочны: зразумела, што хаваць народнага пісьменьніка ўлады задумалі па сваім сцэнары.

Раніца, 24 чэрвеня, 7.20. На двух легкавіках едзем у Бараўляны — Сяргей Быкаў, Генадзь Бураўкін, кіраўніцтва Саюзу пісьменьнікаў. На сьветлафорах адна машына адстае, чакаем яе перад шпітальным КПП. І тут на вялікай хуткасьці (вартаўнік ледзьве пасьпявае падняць шлягбаўм) праносіцца картэж: аўто ДАІ зь мігалкай, катафалк, аўтобус з салдатамі. Падбегам сьпяшаемся да моргу — паўз корпус, дзе ляжыць мой цесьць; малю Бога, каб ён не глядзеў з акна... У моргу вакол труны зь целам Быкава стаяць салдаты на чале з палкоўнікам, які раз-пораз перамаўляецца па рацыі. Абстаноўка напружаная. Чакаем сына, які затрымаўся з другой машынай. Прашу палкоўніка вывесьці салдат — наwошта трымаць труну зь нябожчыкам пад канвоем? Палкоўнік нечакана згаджаецца.

> • Мінуў год... У Рэспубліцы Беларусі не зьявілася ні вуліцы імя Быкава, ні ўнівэрсытэту, ні нават бібліятэкі.

Прыблізна праз гадзіну жалобны картэж пад'яжджае да Дому літаратара. Там ужо людна, на вынасе з катафалка зачыненую труну хтосьці накрывае бела-чырвона-белым сьцягам. Гэта асабліва нэрвуе генэрала Чаргінца, які адчувае сябе галоўным распарадчыкам і пачынае аддаваць загады. Труна ставіцца на сцэне, вакол яе адразу зьяўляюцца вышкаленыя салдаты з роты ганаровага караўлу. Гучыць каманда ўсім, апрача блізкіх, пакінуць памяшканьне. Мы з Барысам Пятровічам вырашаем не падпарадкоўвацца. Бачым, як каржакаватыя дзецюкі са спэцсувязьзю ў вушах блякуюць усе ўваходы й выхады. Салдаты здымаюць вечка з труны, адзін зь іх акуратна згортвае й перадае мне сьцяг. У галавах нябожчыка адразу зьяўляецца другі — чырвона-зялёны, крыж адстаўляецца за кулісы.

Падыходжу да Сяргея Быкава й прашу дазволу накрыць нябожчыка бел-чырвона-белым. Ён маўчыць. Накрываю. Да мяне тут жа падбягае Чаргінец і патрабуе прыбраць «негосударственную символику». Мая адмова бянтэжыць і раздражняе генэрала: адбываецца першы збой у зацьвярджаным уладамі сцэнары.

Хвілінаў дзесяць два сьцягі знаходзяцца ў маўклівым і недарэчным супрацьстаяньні. З прыходам удавы Ірыны Міхайлаўны чырвона-зялёны імгненна зьнікае, разам з ганаровай вартай. Крыж займае сваё ранейшае месца. Пачынаецца адпяваньне паводле ўніяцкага абраду, на якое праз падахоўныя дзьверы ўсё ж прасочваецца чалавек з паўсотні. Падчас адпяваньня ў залі зьяўляецца міністар культуры Гуляка — старшыня дзяржаўнай камісіі па пахаваньні. Пастаяўшы колькі хвілінаў, ня выказаўшы спачуваньня родным Быкава, увогуле не прамовіўшы ні слова, паважна сыходзіць.

Пасьля багаслужбы да мяне мо ў пяты ці шосты раз падбягае мітусьлівы Чаргінец і зноў патрабуе прыбраць нацыянальны сьцяг. Тлумачу, што гэта сьцяг Быкава і на ляцкане ягонага пінжака прышпілены такі самы. «Ну, тады дзяржава адсюль сыходзіць!» — заяўляе генэрал і кіруецца да выхаду. І сапраўды, вайскоўцы пачынаюць пакідаць залю, а праз паўгадзіны знаёмы яшчэ з Бараўлян палкоўнік з палёгкай, як мне падалося, паведамляе, што няма кім камандаваць — зь ім засталося ўсяго некалькі салдатаў.

Дзьверы разблякаваныя, народ запаўняе залю, вэстыбюль, лесьвіцы, пачынаецца разьвітаньне. Выходжу на сьвежае паветра й бачу цэлую вуліцу людзей, хвост калёны хаваецца за рогам будынку, там, дзе крама «Жако».

...Да плошчы Якуба Коласа труну несьлі на руках, потым паставілі ў катафалк. І тут улады ў апошні раз паспрабавалі перахапіць ініцыятыву ў свае рукі. Кіроўца атрымаў каманду ехаць хутчэй. Людзкі натоўп тут жа шчыльна самкнуўся перад катафалкам, і я чуў, як шафёр рашуча крычаў некаму: «Я па людзях не паеду!» Шэсьць аўтобусаў, замоўленых дзеля падвозу людзей, так і не зьявіліся, і старэнькія бабулькі мусілі з апошніх сілаў ісьці дзясятак кілямэтраў (поруч са мной ішла 80-гадовая Валянціна Выхота, прыцiскаючы да грудзей збаночак з васількамі). Тым часам даішнікі блякавалі павароты з праспэкту, каб стварацца заторы.

Калі працэсія зайшла ў браму Ўсходніх могілак, сотні галасоў заглушылі «Магутны Божа»...

Мінуў год з дня сьмерці Васіля Быкава. У Рэспубліцы Беларусі не зьявілася ні вуліцы імя Быкава, ні ўнівэрсытэту, ні нават бібліятэкі. У дзяржаўным выдавецтве ня выйшла ніводнай быкаўскай кнігі. Улада працягвае сваю зацятую вайну зь пісьменьнікам. Але духоўнаму праваднырyу нацыі зусім неабавязкова быць фізычна прысутным між людзтва. Наадварот, голас *адтуль* заўсёды больш пераканальны й заглушыць яго немагчыма.


# ARCHE

**твой любімы часопіс**

падпісны індэкс 00345



Цяпер у новым абліччы і праз падпіску

Васіль Быкаў

# Чырвоны нататнік

**Чырвоны нататнік з гэтымі запісамі Васіль Быкаў перадаў Валянціну Тарасу, перакладчыку «Доўгай дарогі дадому» на расейскую мову, з тым каб імі было дапоўненае расейскае выданьне кнігі. З ласкі В.Тараса мы падаём тут зь нязначнымі скаротамі некаторыя з запісаў, што адкрываюць пісьменьніка, якога пры жыцьці мы так да канца ня зьведалі і не зразумелі. Падзагалоўкі — ад газэты, акрамя першага. Цалкам запісы выйдуць у расейскім выданьні ўспамінаў пісьменьніка ў выдавецтве «Кніга».**




АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Першыя старонкі нататніка, аформленыя самім пісьменьнікам. На першай старонцы — уклеены гімн «Магутны Божа».**

## Лета, лецечка, лецейка

1. Лета чакалася, марылася, набліжалася ў думках-мроях. А яно марудзіла, вясна доўжылася. Вясна таксама няблага, але ж — школа. Ізноў жа — бясхлебіца, шчаўе ды крапіва. Траўнікі, ад якіх баліць у роце.

Ды во нарэшце школа ззаду, падручнікі — на паліцу. Крыху кепска — бяз школы няма кніжок, чытаць няма чаго. Затое — воля і — возера. Наладжваем вуды. Кручкі здабылі загадзя, ёсьць пару з вушкамі, а то цяпер у крамах — толькі з пляскатымі канцамі. Тыя дрэнна трымаюцца ў валасянай, зьвязанай вузялкамі лесцы. Тую «ляску» вяжам з валасоў, выдраных з хваста белай кабылы. На жаль, яна адна ў калгасе — белая. Брыгадзір сварыцца... Але брыгадзір увогуле добры, Антон Стрыжонак, і сварыцца ён нязлосна.

На рыбу я ўстаю на зары і — на возера. Вядома ж, Беляноўскае (так мы яго завем). Каб ня йсьці праз Саўчонкі, дзе нядобрыя рабяты (могуць пабіць), узьлязаю на гару ля Саўчонак-Гараняў, адтуль — сьцежкай праз алешнік да возера. Чарвякі тут жа, у беразе. Настае вялікая піліпіца — я і паплавок, нічога больш не існуе. Першая паклёўка, кругі на вадзе. Але паклёўка — яшчэ ня рыбіна. Рыбы клююць дужа ашчадна, баючыся ці што. Сонца ўскочваецца над лесам, прыгравае плечы ў кашулі, а ў мяне толькі дзьве платвічкі. Да абеду, можа, чатыры. Мяняю месца, хаджу сюды-туды па беразе. Месцаў, здатных для рыбалкі, тут аднак жа няшмат — усё трысьнёг, гарлачыкі. Бяда, калі адарвецца кручок. Бывае, што ён апошні.

Пад полудзень на бераг прыходзіць хто-небудзь з навакольных вёскаў, мала знаёмы. Здаля чую размову: «Хто то вудзіць?» — «Ды гэта Ладзімераў малец. З Бычкоў...» Значыць, ведаюць. Але я ня ведаю, добра гэта ці не. Можа, лепш, каб ня ведалі. Бо, кажуць, вудзіць рыбу няможна. Лавіць можна толькі дзяржаўным рыбакам. Я ж — не дзяржаўны.

Намокшы добра зьнізу, нарэшце вылязаю з вады, адкасваю мокрыя штаніны. Хочацца есьці. Улоў мой — пяток платвічак і адзін акунёк. Панясу маме, хай сасмажыць.

Ускараскваюся на гару пад Саўчонкі. Тут у крайняй хаце жыве мой аднакласьнік Мішка Саўчанка. Але ён — нейкі чужы. Дружыць зь іншымі хлопцамі.

Добра на возеры, але ж заўтра — на пасту. Падышла радоўка.



**Фатограф Уладзімер Крук здымаў Быкава больш як 40 гадоў. Першы здымак пісьменьніка ён зрабіў у 1960 г. «Тады Быкаў прыехаў у Менск з Горадні ў камандзіроўку. Сустрэліся зь ім у гатэлі «Менск». Так і пазнаёміліся. Першае ўражаньне ад яго — суровы, задуменны чалавек. Аднак, трохі пагутарыўшы, зразумеў: мяккі, шчыры, добры».**
**Нярэдка У.Круку даводзілася бываць у менскай кватэры Быкава. «Усьмешак у яго амаль не было і ў жыцьці, і на фота». Аднак мае ў сваім архіве Крук некалькі здымкаў, дзе Быкаў усьміхаецца. Гэта і вядомае фота з Уладзімерам Караткевічам ды Міколам Аўрамчыкам у рэдакцыі «Маладосці», а таксама тое, дзе Быкаву цісьне руку Мележ.**



## Паста

2. Паста — мой самы нялюбы абавязак.

Радоўка прыпадае кожнага тыдня.

Вёска невялікая, кароў няшмат. Статак пасуць па два пастухі на дзень. Гэты абавязак дапякае штогод — ад вясны да позьняй восені. Праўда, у школьную пару — толькі пасьля заняткаў, а ўлетку — дзень цэлы. Ад зары да зары. Дужа не хацелася ўставаць рана, мама будзіла колькі разоў. Урэшце зьлязаў зь сена ў паветцы, сонны выганяў кароўку. Колькі памятаю, была ў нас Акулярка — рабая, чорна-белая кароўка з плямамі, бы акулярамі, на вачох. Яна карміла сям'ю гадоў дзесяць. Скончыла свой век у вайну, калі яе забралі партызаны — на ўласны пракорм.

Пасьвіць жывёлу не было дзе: уся зямля была занятая пад культуры. Заставаліся парасьнікі, раўкі, пералескі. Трэба было бегаць і бегаць, каб не разбрыліся каровы. Трохі лягчэй рабілася, як пачыналі жаць-касіць — тады пасьвілі на пожнях і ржэўніку. Ногі былі ўсе паколатыя, балючыя. Раніцою (пад восень асабліва) дапякалі росы — сьцюдзёныя, золкія. Ад іх лыткі браліся болькамі. Доўга не гаіліся.

Улетку ганялі жывёлу на паўдзён. Тое давала гадзіны тры передыху ад палявой гарачыні. А пасьля зноў — у поле, да заходу сонца.

Бацькі ў той час — абое на полі. Касьба, сушка, звозка сена. Затым — жаць. Жалі ў асноўным сярпамі. Бабы ў белых хусьцінках скрозь па полі. Снапы ставілі ў бабкі, так дасыхала збожжа. Звазіць сена ў брыках дастаўчалі старэйшым хлопцам — тое было цікава. Асабліва — сядзець высока і пазіраць адтуль на абшары. Але ж дарогі… Аднойчы і я пакіраваў канём з брыкай. Ды на павароце з дарогі ў вуліцу крута павярнуў брыку і абярнуўся. Дужа спалохаўся. Брыгадзір, аднак, ня лаяўся. Толькі болей мне таго не даручалі.

Улетку пасьля пятае клясы пасьвіў коні. Пасьвілі ўдвох з Ільлюком, маім стрыечным братам, мы ўдзень, а ягоны бацька, мой дзядзька Сьцёпка, — уначы. Зноў рана ўставай і каці куды ў дальняе поле — за Гаі ці ў Мамоны, дзе з ночы пасьвіліся калгасныя коні. Коні, вядома, не каровы, спутаныя і спакайнейшыя, але таксама кожны з норавам. Разбрыдуцца — пашукаеш. А то ўлезуць у пасевы, зробяць патраву. Патрава — то найгорш, брыгадзір пагражае аформіць штраф і спагнаць з бацькі. Але ўдзень, як прыгрэе сонца, можна пасядзець у цяньку і пачытаць кніжку. На полудзень па чарзе з Ільлюком езьдзілі конна на якім-небудзь маладым каньку. Раніцай коней разьбіраюць калгасьнікі — у плуг, барану, у калёсы і брыкі. Коні худыя, на кепскай пашы за ноч не напасьвіліся, мужчыны кураць і лаюцца. Дзядзька Сьцёпка лае мяне, што спазьніўся на зьмену. Але пакуль я знайшоў яго ў парасьніках, сонца паднялося высакавата…

## Садок

4. У нас у вёсцы таксама быў сад.

Садок, як звычайна яго прыгадвалі. Садок я любіў — зь вясны, як ён быў у квецені, да восені, як пасьпявалі яблыкі і асабліва грушы — вялікія фунтоўкі і спасаўкі. Спасаўкі высьпявалі да Спаса. Яшчэ да таго часу я зь зямлі перш і ў зручны час узьлязаў на дрэва. Смачныя былі грушкі. Зь яблыкаў смачны быў апорт — адно яго дрэва, але апорты ды іншыя сьпелі позна. Самай, аднак, позьнясьпелай расла ў кутку садка адна дзікая яблынька. Казалі, некалі гэты дзічок пасадзіў дзед, меўся прышчапіць лепшую. Ды сьмерць не дала, застаўся дзічок, заўжды абсыпаны дробненькімі дужа кіслымі яблычкамі. Іх мы зьбіралі ўвосень і ссыпалі на гару пад стрэшша. Яны там мерзьлі, але ўзімку давалі сок, які з содай пілі — нейкі дзівосны пеністы напой, што любіла мама. Тая яблынька, здаецца, і цяпер стаіць адна ў былым садку — старая, скручаная, зьнявечаная часам. Але яшчэ нешта родзіць — крыху знаёмых маленькіх яблычкаў. Іншых дрэўцаў ужо даўно няма.

Без гаспадароў сад нядоўга жыве.

## Як я прапусьціў «Чапаева»

6. Вялікае сьвята здаралася ў школе, калі раптам абвяшчалі, што пасьля 3-га ўроку будзе кіно.

На жаль, тое здаралася рэдка, можа, раз у чвэрць, і разам для ўсёй школы. Бы мурашнік, вясёлыя і дурасьлівыя, мы высыпалі на двор, дзе строіліся ў калёну і з настаўнікамі, радасныя і ажыўленыя, кіравалі ў ДСК (Дом сацкультуры). Ужо ўсе ведалі, якое будзе кіно (пра вайну пераважна), рассаджваліся на лаўках і чакалі, калі выключыцца сьвятло і застракоча апарат. Пачатак фільму зачароўваў, усе заміралі, хапаючы зрокам тытры. У нямых фільмах гэтых тытраў было шмат, трэба было пасьпяваць іх чытаць і глядзець за падзеяй. Фільмы ўсе падабаліся, тады не выпадала «кепскіх» фільмаў. Ідучы дахаты, абмяркоўвалі, спрачаліся. Уначы некаторыя моманты сьніліся — кіно працягвалася.

Тады як я хварэў, якраз паказвалі фільм «Чапаеў», і я яго прапусьціў. Шкадаваў шмат год, то была найбольшая мо крыўда школьных гадоў. Але хто вінаваты? Такі выдарыўся лёс.

## У інтэрнаце

9. У інтэрнаце мастацкага вучылішча былі толькі матрацы з ваты — камячыстыя і нязручныя, на іх і спалі. Коўдры трэба было прывезьці з дому, і я прывёз стракатую коўдрачку, вынятую маці з куфра, як самую каштоўную. Тканая яна была накшталт крыжыкаў — белае з чорным, і мае злыя сябры адразу ўбачылі ў ёй штосьць папоўскае. Ад іхніх папрокаў мне было сорамна, і я накрываўся

# Аўтабіяграфічныя дадаткі да «Доўгай дарогі дадому»

коўдрай толькі ў сьцюжу, зьверху яшчэ клаў тужурку. Тужурка тая дасталася мне ад першага мужа мамы, які ў рэвалюцыю прыехаў з Курляндыі, прывёз самыя каштоўныя рэчы (тужурку, цэлюлоідныя каўнерыкі і манжэты), склаў у куфар. І паехаў у Пецярбург, дзе і прапаў. Мама чакала яго ці ня год пяць, а пасьля, схадзіўшы пешшу на паклон да Эўфрасіньні Полацкай, выйшла замуж за суседаўдаўца Ўладзімера.

## Як я падрабляў рублі

11. Горад вабіў, цікавіў, часам захапляў сельскага жыхара будынкамі і вітрынамі. Часам я заходзіў у сабор, дзе абразоў ужо не было, а з вышыні гайдаўся знакаміты маятнік Фуко — як доказ таго, што бога няма і зямля круціцца. Іншыя саборы пад той час ужо паўзрывалі. Заўжды галодных студэнтаў, аднак, найбольш вабілі сталоўкі, паткнуцца ў якія патрэбна была адвага. Найперш — чыстыя абрусы. Зноў жа — афіцыянткі ў белых фартушках. Нейк яны дужа прыдзірліва аглядалі нас, сарамлівых падлеткаў, прымалі з усьмешкай наш сарамлівы «заказ».

У асноўным харчаваліся хлебам з кіпятнём — па бохану на дзень. Тое каштавала адзін рубель. Аднойчы, як жылі на Смаленскім базары, падрабілі пару рублёў: намалявалі акварэльлю, добра пацерлі (бы старая паперка) — і прадаўшчыца не заўважыла. Але толькі аднойчы. Болей не адважыліся, дый хутка атрымалі стыпэндыю.

## Што такое вайна

16. Страты былі аграмадныя, кулямётным агнём у стэпе выбівалі роты за колькі гадзін. Падалі забітыя, не ўставалі параненыя. Кідацца ратаваць каго было нельга — тое было справа санінструктараў. Яны ж клапаціліся, каб адвезьці параненых у тыл (вядома, цяжкіх, лёгкапараненыя выбіраліся з-пад агню самі). Нельга было пакінуць ланцуг, каб уратаваць каго, калі нават зь сяброў — тое ўважалася як спроба ўхіліцца ад бою. Цяжкапараненыя сыходзілі крывёю і гінулі дзе-небудзь у кукурузе. Лёгкапараненыя калі марудзілі ці не маглі хутка выбрацца, апынаўліся параненыя другі раз ці наагул забітыя. Мой сяржант, паранены ў нагу, перад адпраўкай у тыл хацеў закурыць і счакаў, пакуль ягоны баец прынясе яму цыгарку, ды атрымаў кулю ў жывот. Ня ведаю, ці давезьлі яго да санчасткі.



Гэты здымак Яўген Коктыш зрабіў у менскай кватэры Быкава. У часе размовы пісьменьнік заўважыў, што на кармушку, пачэпленую за форткай, села сінічка. Фатограф злавіў момант.

Хаваць забітых нам не даводзілася, забітых звычайна пакідалі на тым месцы, дзе іх забіла. Не было калі і не было як пад агнём зь імі валэндацца. Старшыя камандзіры ўсё гналі «Ўпярод!». Хавалі ў тыле адмыслова створаныя для таго «пахаронныя каманды». Яны капалі брацкія магілы, сьцягвалі трупы. Распраналі іх, зьбіралі зброю і закопвалі. Забітых улічвалі ў штабе, складалі сьпісы. Але тое зусім ня значыць, што ў магілах ляжаць паводле сьпісу. Часам магло быць, што ляжаць зусім іншыя.

Ад бяссоньня і стомы стан увесь час быў блізкі да поўнай абыякавасьці. Пад агнём не хацелася акопвацца ці хавацца. Заб'е — і чорт зь ім. Абы хутчэй, менш пакутаваць. Куды болей чым страх дапякала сьцюжа. У стэпе, ноччу. Заснуць, аднак, не было як, — мароз зумшаў калаціцца, дрыжэць, стукаць нагамі. Хоць бы лежачы ў сьнезе. Той стан перапынялі толькі каманды ды мацюкі камандзіраў. Ды калі блізкі, ва ўпор, абстрэл. Ці мінамётны агонь. Тады на кароткі час ахопліваў спалох. А затым — зноў стома і абыякавасьць да ўсяго.

## Узбураныя фэміністкі

17. На пачатку перабудовы пісьменьнікі сталі часьцей выяжджаць за мяжу — на розныя кангрэсы, канфэрэнцыі і сустрэчы, вядома ж, па запрашэньні таго боку і за ягоны кошт. Уласнага кошту звычайна мелі 30% сутачных, што складала такую драбязу, зь якой сорамна было зайсьці ў кавярню. Нейк у Нямеччыну паехала вялікая пісьменьніцкая група, сярод якой быў і Адамовіч, што мяне дужа ўсьцешыла. Пасьля даўгога карантыну ў Менску Саша пачуваўся вельмі спрыяльна за мяжой сярод маскоўскіх сяброў, заўжды быў у цэнтры ўвагі, распавядаў, спрачаўся, жартаваў. На пасяджэньнях заўжды браў слова і гаварыў дужа разумна, гаспадары пранікаліся да яго павагай. Аднойчы, здаецца ў Кілі, выступаючы перад маладзёжнай аўдыторыяй, адказваў на пытаньні з залі. І на запыт пра тое, ці праўда, што ў Маскве моладзь не злоўжывае наркотыкамі, а болей чытае кніжкі, сказаў, што справа палягае ў тым, што чытаць; часам лепш не чытаць, а займацца чым весялейшым, бо кніжкі ў нас бальшынёй належаць да сац. рэалізму. А на пытаньні адной фэміністкі сказаў, што ён ня можа падтрымаць фэмінізм, бо чуў, што маладая фэміністка, калі ёй уступілі праход у дзьвярох, прайшла першай, але павярнулася і ляснула па шчацэ таго, хто ёй уступіў. Бо яна за раўнапраўе, а тая ўступка ёсьць прыніжэньне жанчыны. У залі ўсчаўся гвалт, фэміністкі паўскоквалі зь месцаў, кінуліся да сцэны, мы з Адамовічам змушаны былі ратавацца праз чорны ход, і да самага гатэлю за намі беглі разьятраныя жанчыны ды іхнія мужчыны. У гатэлі я сказаў Адамовічу, што болей зь ім не пайду на гэткія шоў, бо не хачу прынасіць сябе ў ахвяру гэткае публіцы.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

3 чэрвеня 2003 году. Васіль Быкаў падпісвае сваю кніжку фатографу «НН» Андрэю Лянкевічу.

## Сядзелі, пілі колу

27. У час майго прыезду ў Заходні Бэрлін наладжваліся сустрэчы з чытачамі. Нейк раз сустракаўся са студэнтамі Свабоднага ўнівэрсытэту. У невялікім кафэ зь дзюралевымі сто-

Працяг на старонцы 10.

# ...нататнік

Працяг са старонкі 9.

лікамі сабралася чалавек пяцьдзясят моладзі. Сядзелі, пілі колу і піва. Я распавядаў, задавалі пытаньні. Што такое Беларусь, ніхто ня ведаў. Пыталіся — дзе яна? У Сібіры ці бліжэй? Адзін маладзён, дужа паддаўшы, палез да мяне з лаянкай: «Чаму вы ўвялі танкі ў Прагу?» Я спрабаваў штось тлумачыць, але маладзён не змаўкаў. Тады малады атлет зь першага століка ўстаў і моўчкі выкінуў таго за дзьверы.

Як усё скончылася, я папытаўся — хто ён, гэты атлет? Аказалася, амэрыканец з Аклахомы. Ён не за савецкія танкі, але ня любіць п'янтосаў і наркаманаў.

А ў другі раз, ужо ў гарадзкім раёне Кройцбэрг, да мяне на сустрэчы падышоў стараваты кульгавы вэтэран, які на ламанай расейскай мове папытаўся, як жывуць цяпер беларусы ў Мазыры і Пухавічах. Аказваецца, ён ведае шмат якія гарады і вёскі ў нашай краіне, дзе добра наваяваўся. А нага? Нагу пакалечыла. Як трапіў у палон, апэрацыю рабіла «артуюда». Кепска зрабіла, таму ён застаўся інвалідам на ўсё жыцьцё. Але ён не крыўдуе — ні на юдэ, ні на Гітлера: кожны рабіў сваю справу. Важна, каб прафэсійна. На жаль, прафэсійнасьці цяпер не стае шмат каму. Дзіўнаватая філязофія, падумаў я. Але чым займаецца цяпер шаноўны вэтэран? — Цяпер на пэнсіі, а да таго быў школьны настаўнік. Выкладаў матэматыку. У тым ліку і вышэйшую.

## Дакладная Андропава

33. Як пасьля стала вядома, старшыня тадышняга Камітэту дзяржбясьпекі СССР Ю.Андропаў дакладваў у ЦК КПСС:

«Камітэт дзяржаўнай бясьпекі Беларусі мае зьвесткі аб нездаровых настроях беларускіх пісьменьнікаў — члена КПСС Карпюка і Быкава... Карпюк нелегальна распаўсюджвае сярод сваіх знаёмых ўсялякія пасквілі ў выглядзе кнігі Гінзбург-Аксёнавай «Круты маршрут» і іншыя. Адмоўна ўзьдзейнічае на моладзь. Пад яго ўплывам студэнт Гарадзенскага пэдінстытуту Малашэнка піша вершы, прасякнутыя пэсымізмам і ўпадніцтвам, некаторыя зь іх утрымліваюць шкодны палітычны сэнс... Погляды Карпюка ў пэўнай ступені падзяляе Быкаў, аўтар тэндэнцыйнай аповесьці «Мёртвым не баліць»... У цяперашні час да Быкава выказваюць інтарэс ідэалягічныя цэнтры ворага. Гэта відаць, прынамсі, зь перапіскі зь ім супрацоўніка закрытага сэктару «Народна-працоўнага саюзу» (НПС), якая вядзе яго антысавецкую апрацоўку. З Быкавым устанавіў кантакт італьянец Поджы, які падазраецца ў прыналежнасьці да спэцорганаў ворага... Камітэт дзяржбясьпекі Беларусі з санкцыі ЦК Кампартыі рэспублікі рыхтуе мерапрыемствы, накіраваныя на прадухіленьне магчымых варожых акцый з боку названых асобаў».

## Фізстарт Шушкевіча

36. Ішло вылучэньне кандыдатаў у Вярхоўны Савет БССР. Канчатковаму іх зацьвярджаньню папярэднічала прыдзірлівая сэлекцыя-абмеркаваньне на т.зв. выбарчых сходах. Прадстаўнікі «грамадзкасьці» падрабязна абмяркоўвалі ўсіх і «рэзалі» няўгодных. Уся справа была ў палітычнай арыентацыі кандыдатаў і падборы прадстаўнікоў.

У Дом культуры, што ля ст. мэтро «Маскоўская», дзе змушаны былі трымаць «агледзіны» з тузін кандыдатаў, прыйшлі (вядома ж, арганізаваныя гаркамам) некалькі соцень спартсмэнаў з Інстытуту фізкультуры. Яны былі вельмі актыўныя, дружна галасавалі за кандыдатаў-камуністых і рэзалі інтэлігентаў. Тады яшчэ да выбарчага старту адхілілі многіх. Але напрыканцы, відаць, стаміліся — забалелі горлы выступаць як «за», так і «супроць». Адзін кандыдат, які доўга чакаў свае чаргі, меў прозьвішча на адну з апошніх літараў алфавіту, і сход на яго проста слаба адрэагаваў у сваім змоўніцкім адмаўленьні.

Тым кандыдатам апынуўся С.Шушкевіч, які з таго сходу зрабіў свой бліскучы палітычны старт.

**Аднаго разу Быкаў прыйшоў у маю майстэрню, — распавядае Анатоль Кляшчук. — Для мяне гэта была вялікая падзея. Была ў мяне адна задума — стварыць вялікую галерэю выбітных дзеячоў. Вось жа і Быкаў мусіў быць сярод іх. Мне трэба было зьняць яго і буйным плянам, і як ён стаіць ды сядзіць. Мы працавалі доўга, але ён ня скардзіўся. У мяне была такая старая шафа бязь дзьверцаў, бяз задняй сьценкі. І я ставіў туды людзей, каб паказаць іх у нейкай абмежаванай, абляманай прасторы. Хацелася, каб яны там на зэдліку пачувалі сябе ўтульна. Гэтак здымаў і Быкава. Ён усё разумеў, добра пазіраваў. Мяняў паставы. Ён разумеў, што гэта сур'ёзная праца. Але пры тым ён думаў пра нешта сваё. Я — пра сваё. Мяне гэта задавальняла. Выходзіла, што ён не пазіраваў адмыслова для маіх здымкаў.**




# Быкаўская калекцыя Музэю гісторыі літаратуры

Калекцыю матэрыялаў пра Васіля Быкава, якая захоўваецца сёньня ў Музэі гісторыі беларускай літаратуры, супрацоўнікі музэю называюць «легендарнай». Каштоўнасьць архіву тым большая, што сабраў і перадаў яго музэю сам пісьменьнік.

Для берагіні калекцыі, галоўнай захавальніцы фонду музэю Валянціны Ціханавецкай сустрэча з Васілём Быкавым і праца над яго пэрсанальнай выставай (1994) сталі падарункам лёсу. Спн.Валянціна дагэтуль памятае па датах дні, калі адбываліся сустрэчы. З самага дня ўзьнікненьня музэю ў 1987 г. яна марыла пра стварэньне калекцыі, прысьвечанай Быкаву.

Першым экспанатам стаў чамадан перапіскі з Твардоўскім, Салжаніцыным і іншымі, які захоўваўся на дачы ў пісьменьніка. Пазьней Васіль Быкаў перадаў музэю цэлы архіў, складзены




**Валянціна Ціханавецкая з Быкаўскім архівам.**

так, нібыта яго зьбіраў прафэсійны музэязнавец — настолькі дакладна ўсё было сыстэматызавана, пранумаравана і падпісана. Усяго архіў налічваў 1400 адзінак — апошнія рукапісы «Сьцюжы», «На чорных лядах», гранкі з праўкамі цэнзуры арыштаванай кнігі «Мёртвым не баліць», фатаздымкі (зьмешчаны побач — таксама з архіву), у тым ліку зробленыя самім Быкавым, дэпутацкія пасьведчаньні, эцюды, кнігі, у тым ліку пераклады ягоных твораў на самыя экзатычныя мовы сьвету з аўтографамі перакладчыкаў. Адзінае, чаго няма ў архіве, — гэта асабістых рэчаў пісьменьніка: было няёмка выстаўляць іх пры жыцьці чалавека.

Васіль Быкаў перадаў усё бескарысьліва. За некаторыя нашмат бяднейшыя архівы музэй плаціў уладальнікам каля 150 даляраў, але гэта мізэр ад іх сапраўднага кошту, архіў жа Быкава і зусім бясцэнны.

Валянціна запомніла Васіля Быкава як вельмі пунктуальнага, арганізаванага, простага і ўважлівага чалавека.

Бацька Валянціны ваяваў у тых жа мясьцінах, што і Быкаў, і памёр у 1984 г. Таму для яе выстава Быкава — гэта яшчэ і даніна павагі, у тым ліку і сваёму бацьку.

«Гэтага архіву мы яшчэ не асэнсавалі. Ён яшчэ толькі апісваецца. Гэтак жа, як не асэнсавана яшчэ ўся спадчына Быкава, значэньне яго для нацыі», — кажа Валянціна Ціханавецкая.

Матэрыялы з архіву Васіля Быкава будуць прэзэнтаваны ў Музэі гісторыі беларускай літаратуры з 23 чэрвеня на выставе «Доўгія вёрсты вайны».

**Вераніка Дзядок**



АПЫТАНЬНЕ «НН»

# Задам наперад: Беларусь у Эўразію

«Наколькі выгадна далучэньне Беларусі да Эўраазіяцкай эканамічнай прасторы?» — з такім пытаньнем мы зьвярнуліся да экспэртаў.

Палітоляг **Віталь Сіліцкі** кажа, што наагул «гэткі саюз нам не патрэбен»: «95% інтарэсаў нашай краіны на Ўсходзе забясьпечвае Расея, сур'ёзных эканамічных стасункаў з астатнімі краінамі няма. Эўраазіяцкі саюз — чыста расейскі праект. Дык навошта нам у такое ўвязвацца?» Яму пярэчыць галоўная рэдактарка часопісу «Лідэр» **Таццяна Гацура:** «Сапраўды, пагадненьне нясе Беларусі шмат выгад: палепшыцца сытуацыя з заканадаўствам і падаткаабкладаньнем, павысіцца эфэктыўнасьць вядзеньня бізнэсу з краінамі-суседзямі». З гэтым пагаджаецца аглядальнік газэты «Белорусский рынок» **Паўлюк Быкоўскі:** «Так, на тэрыторыі прасторы ствараецца агульная свабодная мытная зона: тавар, паслугі, капіталы змогуць рухацца безь перашкод». Але журналіст у гэтым жа бачыць і адмоўны бок інтэграцыі: «Наўрад ці з дапамогай ЭўрАзЭС зьменіцца гандлёвы абарот, бо гандлюем мы зьбольшага з Расеяй, а ў Расеі падаткі вышэйшыя. Так што Беларусь ад такога супрацоўніцтва нічога не атрымае».

Эканаміст **Яраслаў Раманчук** лічыць, што інтэграцыя ў «саюз чатырох» — для Беларусі «добрая трэніроўка»: «Калі будуць рэальна дзейнічаць дэкляраваныя правілы і паміж краінамі складзецца зона вольнага гандлю — гэта будзе карысна для Беларусі і можа надалей паспрыяць у адносінах нашай краіны з Эўразьвязам». Але пакуль, кажа сп.Раманчук, існуе «імітацыя інтэграцыі». «У гэтым уся і небясьпека, бо рэальных зрухаў не адбываецца і такі саюз пакуль выгадны толькі чыноўнікам ды бюракратам».

«Падаецца, што дзейнасьць ЭўрАзЭс скіравана не на ствараньню працу, а на вяртаньне назад. Беларусь у такім кантэксьце нагадвае чалавека, што ідзе задам: глядзіць, здаецца, наперад, а крочыць у адваротны бок», — заўважае **Мікола Маркевіч.**

«Беларусі патрэбна глыбокая структурная рэарганізацыя эканомікі, каб павысіць канкурэнтаздольнасьць, зьнізіць узровень беспрацоўя. І адмоўныя тэндэнцыі толькі ўскладняюцца. У рамках «саюзу чатырох», наколькі я ведаю, такія задачы ня ставяцца, бо пагадненьне паміж краінамі скіравана на праблему замежнага гандлю. Нам прапануюць штучную падтрымку, бо рэальна Беларусь сваіх эканамічных праблем з дапамогай ЭўрАзЭС ня вырашыць. Больш за тое, у рамках такога саюзу адбудзецца кансэрвацыя той сыстэмы, якую мы маем», — кажа кандыдат эканамічных навук, начальнік аддзелу лізынгавых апэрацый ЗАТ «Міжгандальбанк» **Аляксандар Ягораў**. Павышэньне ўзроўню экспартных адносін, гандлёвыя зьніжкі ды іншыя замежнагандлёвыя выгады сп.Ягораў лічыць аднамомантнымі: «Неэфэктыўная вытворчасьць прывядзе да вытворчасьці неканкурэнтаздольнай прадукцыі, таму ўзровень экспарту ўсё роўна зьнізіцца. Нам трэба рэфармаваньне эканамічнай сыстэмы, таму варта скіраваць увагу на іншы вэктар — Эўразьвяз», — лічыць сп.Аляксандар.

**Сяргей Будкін**


# Аналітычны праект

**Вядучыя беларускія палітолягі, праваазнаўцы, эканамісты, сацыялёгі, спэцыялісты ў галіне адукацыі напісалі гэтую кнігу, каб напоўніць жывым зьместам малапрадметны выраз «Эўрапейскі выбар для Беларусі». Калі Вы хочаце ведаць, у якім стане цяпер знаходзяцца беларуская палітычная, эканамічная, сацыяльная і адукацыйная сыстэмы і што трэба зрабіць зь імі, каб Беларусь сталася паўнапраўным чальцом Эўрапейскага Зьвязу, то гэтая кніга для Вас.**

**Беларусь: сцэнары рэформаў**

Даслаўшы на адрас 220018, Менск, а/с 3 замову з пазначэньнем Вашага імя, імя па бацьку і прозьвішча, а таксама дакладнага адрасу, Вы атрымаеце кніжку бясплатна.




Сяргей Альфер, Зьміцер Бабіцкі, Валер Булгакаў, Уладзімер Валетка, Аляксандар Вашкевіч, Аляксандар Гатоўскі, Валер Дашкевіч, Андрэй Екадумаў, Максім Жбанкоў, Андрэй Завадзкі, Марына Загорская, Міхал Залескі, Уладзімер Калупаеў, Міраслаў Кобаса, Сьвятлана Крупнік, Юрась Ліхтаровіч, Андрэй Ляховіч, Уладзімер Мацкевіч, Пётра Натчык, Аляксандар Палоньнікаў, Міхаіл Пастухоў, Міхась Пліска, Віталь Сіліцкі, Віктар Чарноў, Андрэй Шабуня

Беларусь: сцэнары рэформаў.
Варшава: Фонд імя Сьцяпана Батуры, 2003.


# Адзіная жанчына на Казарменным

Працяг са старонкі 3.

**— Нягледзячы на твой аптымізм, разам з генэральскім у сяброў выклікае непакой і тваё здароўе. Як ты сябе адчуваеш?**

— Я не хаваю нічога. На днях мяне на кампутары пратэставала лекарка, яе папрасілі мае знаёмыя. Адбываюцца зьмены на клетачным узроўні. Доктарка сказала, што, калі паказьнікі здароўя клетак упадуць яшчэ на пяць пунктаў, гэта прывядзе да незваротных працэсаў у некаторых сыстэмах арганізму. Пачынае скакаць ціск ня толькі ў мяне, але і ў хлопцаў, гэта самае дрэннае. П'ём таблеткі кожны ад сваіх балячак, што выявіліся. Сушыць скуру, калоціць, сядзім у вопратцы. Хутка стамляюцца мускулы.

**— Што больш за ўсё падтрымлівае?**

— Мае сябры па партыі ўсе да аднаго пабывалі ў мяне. І я бачыла іхнае перажываньне, гэта было так кранальна. Мужчынам хочацца хоць крышку перадаць мне свае сілы. Хто ў шчочку цмокне, хто руку пацалуе, хто абдыме. У мяне такое адчуваньне, што я для іх маленькая дзяўчынка і яны мяне хочуць захіліць і абараніць.

**— Марына, галадоўка падыходзіць да стадыі, калі становіцца вельмі небясьпечнай. Што далей?**

— Галоўнае — ня страціць пачуцьця гумару. Мне ня хочацца так хутка слабець. Бо я ўсё ж лічу, што жанчына мацнейшая. Я хачу падтрымліваць мужчын, калі ім зробіцца кепска.

**Гутарыла Натальля Валакіда**

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты, мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам. Наш адрас: а/с 537, 220050, Менск. E-mail: nn@promedia.by. Факс: (017) 284-73-29.

# «…каб пасада прэзыдэнта перайшла да палітыка залатой сярэдзіны»

Працяг са старонкі 1.

Беларусь больш не разглядаецца як пераходная краіна. Рэформы закончыліся. Кіраўніцтва прыняло для сябе рашэньне быць там, а ня тут.

**«НН»: Якое ўражаньне зрабіла апазыцыя ў Брусэлі й Бэрліне?**

**А.Р.:** Калі ў выніку гэтых паездак апазыцыя зьядналася вакол аднаго кандыдата, палітычна прымальнага для цэнтрысцкага электарату, — гэта адно. Аднак калі апазыцыя едзе на Захад, каб шукаць фінансавай дапамогі для барацьбы з рэжымам, то гэта будзе пераход у такую небясьпечную фазу, калі яна перастане быць апазыцыяй, а стане дысыдэнцтвам. Дысыдэнты былі ў савецкія часы сьмелымі людзьмі і нават пакутнікамі, але палітычны працэс ад гэтага не абавязкова выйграваў. Я спадзяюся, што палітычны працэс у Беларусі ўсё ж будзе адбывацца па-іншаму, што апазыцыя не ператворыцца ў дысыдэнцкае асяродзьдзе, што яна будзе шукаць кампрамісаў. Я не гавару пра кампрамісы з Лукашэнкам, але з тым істэблішмэнтам у Беларусі, які знаходзіцца як бы «паміж» і таксама ня мае вялікага ўплыву на беларускую палітыку. Ідэальна было б, каб пасада прэзыдэнта перайшла ад Лукашэнкі, які б не балятаваўся ўжо ў трэці раз, да нейкага палітыка залатой сярэдзіны. Дастаткова дэмакратычнага, эўрапеізаванага, але й дастаткова кансэрватыўнага для беларускага электарату.

**«НН»: Ці выжыве грамадзянская супольнасьць пад такім прэсам, як цяпер, без дапамогі з-за мяжы? А калі ня выжыве, ці можна будзе гаварыць пра палітычныя перамены?**

**А.Р.:** Я згодзен з такім аргумэнтам, ён важкі. У той жа час трэба абдумаць і іншае. У якой ступені ў вачах беларусаў дапамога Захаду, ідэнтыфікацыя толькі з заходнімі праграмамі, з заходнімі надзеямі, з заходнімі плянамі да Беларусі ў палітычным пляне прыводзіць да таго, што частка людзей не разглядае прадстаўнікоў апазыцыі як сапраўды незалежных, нацыянальных палітыкаў? Ва Ўкраіне, напрыклад, грамадзянская супольнасьць не абавязкова грунтуе свой уплыў і свае магчымасьці толькі на дапамозе Захаду, а далучае да свайго крэда і рэсурсы знутры краіны. Не хачу ні ў чым абвінавачваць беларускую апазыцыю, тым больш што яна робіцца ўсё больш кансалідаванай сілай, бо Лукашэнка не ідзе ні на якія кампрамісы, ды ўсё ж хацелася б, каб гэтыя палітыкі-героі ішлі ў народ і не абмяжоўваліся тымі магчымасьцямі, якія яны маюць дзякуючы заходнім структурам, а шукалі супольную мову з кансэрватыўна і нацыянальна настроеным электаратам, які мае шмат пытаньняў да таго, што ўяўляе сабой сёньня Захад.

Ня выключана, што змагацца з такім аўтарытарызмам, як беларускі, сапраўды можна толькі дысыдэнцкімі мэтадамі. Але, на жаль, эфэкт ад дысыдэнцкага змаганьня абмежаваны. Не дысыдэнты развалілі Савецкі Саюз, і не яны сталі палітыкамі ў постсавецкіх краінах.

**Гутарыў Мікола Бугай**

ДАРЭЧЫ

Новым паслом Нямеччыны ў Беларусі будзе спадар Хекер, былы пасол ва Ўзбэкістане, добры знаўца былога СССР. Працаваў раней у Расеі і Цэнтральнай Азіі. Беларусь будзе адным з апошніх пунктаў у ягонай дыпламатычнай кар'еры.

# ХРОНІКА РЭПРЭСІЙ І СУПРАЦІВУ

2 чэрвеня Міністэрства сувязі і інфармацыі адмовіла УП **«Марат»** («БДГ») і **ТАА «Выдавецкі дом «Інтэкс-прэс»**, што займаюцца распаўсюдам незалежных выданьняў, у праве праводзіць падпіску на свае выданьні і іх дастаўку з прычыны адсутнасьці «тэхнічнай базы, якая б дазваляла ажыцьцяўляць дастаўку на тэрыторыі г.Баранавічы, Пінск, Ляхавічы, Ганцавічы, Нясьвіж друкаваных выданьняў у дзень іх выхаду». Ліст з адмовай падпісала намесьнік міністра Н.Гаўрылава. Прадстаўнікі «Марату» і «Інтэкс-прэсу» маюць намер абскарджваць рашэньне ў судзе.

3 чэрвеня УЖРЭП Ленінскага раёну Горадні зьвярнулася ў Гаспадарчы суд з пазовам, у якім патрабуе выселіць з займаных памяшканьняў **гарадзкую арганізацыю ТБМ** і **грамадзкую арганізацыю «Бацькаўшчына»**. За што? Бо згаданыя арганізацыі дазволілі разьмясьціць у арандаваным памяшканьні офіс незалежнай газэты «День».

9 чэрвеня ў Бялынічах падчас сустрэчы зь мясцовымі жыхарамі затрымалі кіраўнікоў магілёўскай «Пяцёркі+» **Рыгора Костусева** (БНФ), **Уладзімера Шанцава** (АГП), **Галіну Лісіцыну** (Партыя працы) і **Анатоля Заўялава** (ПКБ).

9 чэрвеня каля 15-й на рынку «Дынама» затрымалі актывістаў «Зубра» **Сяргея Рыкава** і **Рамана Казакевіча**, якія раздавалі прадпрымальнікам бюлетэнь «Камэрсант» з заклікам далучыцца да страйку 17 чэрвеня.

10 чэрвеня ў Наваградку супрацоўнікі міліцыі затрымалі **двух актывістаў руху «Зубр»**. Міліцыянты канфіскавалі ў іх фотаапарат і адпусьцілі.

10 чэрвеня ў Менску каля 4-й раніцы затрымалі **Аляксандра Апраніча** ў той момант, калі той рабіў графіці «Свабоду Марынічу!». На яго склалі пратакол як за «Дробнае хуліганства», судзьдзя Рагозіна дала яму штраф у памеры базавай велічыні.

10 і 11 чэрвеня міліцыянты затрымлівалі віцебскага апазыцыянэра **Барыса Хамайду**, пакуль Аляксандар Лукашэнка браў удзел у сэмінары для кіраўнічых работнікаў у Віцебску. Пратаколу не складалі, прадстаўнікі правапарадку растлумачылі затрыманьне тым, што сп.Хамайда «ня рады прыезду прэзыдэнта». Агулам Б.Хамайда правёў у пастарунку каля васьмі гадзінаў.

11 чэрвеня судзьдзя Жлобінскага раённага суду Зоя Ласоўская адхіліла пазоў актывіста АГП, дэпутата райсавету **Марата Афанасьева** да адміністрацыі Мэталюргічнага заводу, кіраўніцтва якога ў сакавіку вынесла яму як начальніку бюро адразу тры пакараньні, у іх ліку і скарачэньне ягонай пасады. **М.Афанасьеў** лічыць дзеяньні адміністрацыі заводу палітычна матываванымі.

11 чэрвеня ў гандлёвым цэнтры «Максымус», што ў менскай Малінаўцы, затрымалі трох непаўналетніх актывістаў «Зубра» за распаўсюд бюлетэню «Камэрсант». 14 чэрвеня да аднаго зь іх — **Сяргея Гарэлава** — завіталі дамоў супрацоўнікі КДБ і папрасілі яго расказаць перад відэакамэрай пра абставіны затрыманьня 11 чэрвеня і пра рух «Зубр».

15 чэрвеня актывістаў «Зубра» **Аляксея Шыдлоўскага** і **Алеся Атрочанкава** затрымалі на Камароўцы. Яны раздавалі ўлёткі з інфармацыяй пра галадоўку дэпутатаў і пра палітвязьняў. **Аляксея Ляўковіча** і **Зьмітра Шчэпава** затрымалі ля мэтро «Кастрычніцкая», **Паўла Юхневіча** — ля мэтро «Пушкінская».

15 чэрвеня ў пракуратуры Менску адбыўся новы допыт кіраўніка АГП **Анатоля Лябедзькі**. Палітыка вінавацяць у паклёпе на прэзыдэнта: у інтэрвію РТР ён крытыкаваў Лукашэнку за ўтойваньне грошай ад продажу зброі.

15 чэрвеня суд Заводзкага раёну Менску прыняў рашэньне аб канфіскацыі маёмасьці ў актывіста АГП **Алеся Карніенкі**, паколькі той ня здольны выплаціць штраф у памеры 1 млн. 650 тыс. руб., накладзены на яго за арганізацыю 7 лістапада летась акцыі грамадзкага галасаваньня ў справе трэцяга прэзыдэнцкага тэрміну А.Лукашэнкі.

**Сяргей Будкін**



WWW.OOOK.CZ

# Прагу акупавалі каровы

**Жоўтыя, у колерах нацыянальнага сьцяга — для патрыётаў, у колерах Эўразьвязу — для палітыкаў, у гарошак і пад зэбру — рагулі на кожны густ, парамі і па адной, з рамонкамі ў роце і бяз гэных — паўставалі ў сквэрыках і на скрыжаваньнях сталіцы Чэхіі. Глядзіцца вельмі міла і па-свойску. «Cow parade» сучаснага мастацтва, спансаваны тэлекамунікацыйнымі кампаніямі, — не адзіная акцыя сучаснага мастацтва ў горадзе. Проста пад конным помнікам сьвятому Вацлаву скульптары разьмясьцілі алюміневыя жаночыя ножкі ў карункавых прыспушчаных майточках.**


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Аплявуха Белнэту

**Справа Караленкі скончылася лагодным — тры базавыя велічыні — штрафам, як за дробнае хуліганства. Але быў прызнаны той факт, што распаўсюджваньне музычных файлаў у Інтэрнэце — правапарушэньне. Між тым у нашых умовах распаўсюджваньне музыкі, літаратуры, інфармацыі праз Інтэрнэт — справа ня толькі патрэбная, але і карысная.**

Нарэшце прагрэс дайшоў і да Беларусі! Падобныя пытаньні турбавалі цывілізаваны сьвет зь сярэдзіны 90-х, калі зоркі шоў-бізу падзяліліся на дзьве часткі: адны казалі, што распаўсюд іх твораў праз Інтэрнэт (няхай і без дазволу) будзе толькі спрыяць папулярнасьці, другія, як, напрыклад «Metallica», былі катэгарычна супраць, называючы разьмяшчэньне іх твораў у фармаце .mp3 пірацтвам.

Натуральна, што зьяўленьне музыкі ў Інтэрнэце балюча ўдарыла па буйных гуказапісвальных кампаніях, бо зьявілася альтэрнатыва CD: цяпер кожны амаль за бясплатна можа запісаць сабе зборнік. Колькасьць сайтаў з музыкай у .mp3 няўмольна расьце і нават складае канкурэнцыю парнасайтам. Музычная грамадзкасьць мусіць з гэтым фактам папросту зьмірыцца, некаторыя ж зоркі нават пачалі запісваць інтэрнэт-альбомы. Зусім нядаўна, напрыклад, Джордж Майкл абвясьціў, што ягоныя новыя песьні можна будзе знайсьці толькі ў Інтэрнэце, на дыску выдавацца яны ня будуць.

Пазоў РУПІУ да Хведара Караленкі, стваральніка неафіцыйнага «песьняроўскага» сайту Pesniary.com, мог быць выкліканы адсутнасьцю попыту на двайны дыск «Песьняроў» (песьні на музыку Ігара Лучанка), які ў менскіх дыскарнях каштуе 25 тыс. руб. «Гэтыя ж песьні можна было спампаваць на сайце Караленкі абсалютна бясплатна, а таму можна казаць пра нанясеньне матэрыяльнай шкоды», — так, напэўна, разважалі прадстаўнікі юрыдычнай канторы. Хоць не ўлічылі таго, што якасьць трэкаў нізкая (чым ніжэйшая якасьць — тым хутчэй песьня пампуецца), а некаторыя творы былі выкладзены для азнаямленьня. Так што, відаць, справа не ў Інтэрнэце, а ў «кусачай» цане.

«Калі нехта занатуе ў гасьцявой кнізе якой сталовай верш вядомага паэта — што, гэты паэт будзе падаваць у суд за незаконны распаўсюд?» — спрабаваў даказваць суду Юры Зісер, кіраўнік парталу Tut.by. Сапраўды, Інтэрнэт выконвае найперш азнаямляльную функцыю, бо ў найбліжэйшым часе інтэрнэт-выданьні ня змогуць замяніць друкаваныя часопісы і газэты, а .mp3-файлы — дыхтоўна аздобленыя CD. У нашых жа ўмовах распаўсюджваньне музыкі, літаратуры, інфармацыі праз Інтэрнэт — справа ня толькі патрэбная, але і карысная. Так што справа Караленкі ня цягне нават на дробнае хуліганства.

**Сяргей Будкін, sb1@tut.by**

**Пяцёрка самых папулярных інтэрнэт-сайтаў, дзе можна знайсьці .mp3 айчынных музыкаў (паводле Akavita.by):**
**1) Music.tut.by;**
**2) Music.fromby.net;**
**3) Westrecords.by;**
**4) Tvr.by/rus/crossparad;**
**5) Pesniary.com**

# «Сям'я» сабрала поўны Дом

Вечар 9 чэрвеня паставіў перад пакутлівым выбарам: у Купалаўскім ігралі прэм'еру «Эрыка XIV» і ў той жа самы час у Доме літаратара праходзіла прэзэнтацыя новай кніжкі Адама Глёбуса «Дом». Пераважыў той аргумэнт, што п'есу Стрындбэрга можна будзе ўбачыць і потым.

Гэтаксама палічыў не адзін я. Публікі сабралася настолькі шмат, што некаторыя папросту ня трапілі ў залю: ахвотных аказалася значна больш, чым магла «прыняць» актавая заля пісьменьніцкага Дому.

На сцэне па чарзе зьяўляліся жыхары «Дому» — унук, брат, маці і дачка аўтара, а таксама тыя, хто спрычыніўся да выхаду кніжкі. Скончыла праграму «сямейнага» выступу жонка Ўладзімера Адамчыка Алена, якая раскідала па зале «карткі-запрашэньні» на сваю будучую імпрэзу.

Затым сям'я Адамчыкаў саступіла сцэну рок-музыкам. Быў «Паветраны шар» на біс і адчуваньне, што дзеля такіх імпрэзаў трэба ці будаваць новы — разы ў тры большы — Дом літаратара, ці акупаваць Палац Рэспублікі.

**Алесь Квіткевіч, Болачка**

ДЫСКАГРАФІЯ

# Сярога


«Мой двор: свадьбы & похороны». (C) & (P) Go Records

З гэным Сярогам (Сяргеем Пархоменкам) мне давялося вучыцца ў адной гомельскай СШ. Жыў ён у Старой Валатаве, якая была тыповым гомельскім маргінэсам з адпаведнай паўкрымінальнай атмасфэрай. Дык жа матывы паэтызацыі гарадзкіх ускраін у творчасьці Сярогі вельмі адчувальныя (чыткі «Чорны бумэр», «Песенька пра сьлесара шостага разраду», «Маньчына вясельле»). На жаль, у тэкстах гэтая тутэйшасьць не падкрэсьлена: аўтар унікае беларускай тапанімічнай прывязкі сюжэтаў сваіх кампазыцый, праз што і губляецца цымус. Прычына вядомая — прадукт арыентаваны на «постсавецкую прастору». Адсюль у тэкстах «кароль маскоўскіх вуліц», «дзеці Масквы», «сутэнэры на Цьвярской», то бок джэнтэльмэнскі набор расейскага, так бы мовіць, шансону. Хацелася б усё ж больш *двара* і менш *Масквы*.

Сам Сярога добра спалучае стылістыку таго самага шансону і рэпу. Што да зьместу, то часьцяком дужа цяжка зразумець, ці аўтар сур'ёзны, ці ён займаецца пародыяй. Цяжка ўсур'ёз успрымаць рэп пра пахаваньне крутога маскоўскага бандзюгана і ягоны жыцьцяпіс, калі ў самым пачатку называецца імя яго жонкі — Параня («Пра Лёньку Фінта»).

Безумоўныя гіты — памянёны «Чорны бумэр» (пра простага хлопца, што любіць катаць дзевак на сваім самаходзе) і «Загубілі Лялю» (сапраўды трагічная гісторыя пра дзяўчынку, што, пакахаўшы не таго, пайшла кепскай дарогай). Радыёвэрсія «Лялькі» на парадак прайграе арыгіналу, якога на альбоме нямашака. Няма тут, дарэчы, хоць бы і бонус-трэкам, і беларускамоўнага варыянту гэтай самай песьні, вядомай па складанцы «Пасадзіў DEAD RAPку». Але ў белмоўных слухачоў ёсьць добрая магчымасьць самім перакласьці песеньку пра бумэр і сьпяваць яе на прыватных вечарынках, бо мінусоўка («караоке-вэрсія») у наяўнасьці. «Сядай сьмялей, дзявулька, пакатаемся з табой!».

IN MEMORIAM

# Змоўк бацька соўлу

Ураджэнец штату Джорджыя Рэй Чарльз (нар. 1930) пайшоў з жыцьця не ў чарзе па пэнсію, а практычна на звыклым рабочым месцы… Яму, сыну чыгуначніка, здавалася б, не шанцавала з маленства. У дзесяць гадоў з прычыны хваробы ён страціў зрок. Бацькі аддалі яго ў спэцыяльную школу для дзяцей-інвалідаў, дзе ў Рэя раптам адкрыліся надзвычайныя здольнасьці да музыкі. Неўзабаве ён ужо ўпэўнена валодаў ня толькі фартэпіяна, але й саксафонам, трубой, клярнэтам.


WWW.PICTUREPLACE.DE

**Адным з сваіх настаўнікаў Рэй Чарльз называў Шапэна.**

Яму было 15 год, калі ён пачаў выступаць у начных клюбах Флорыды, выконваючы перш за ўсё клясычны блюзавы рэпэртуар. Асобаю ён зрабіўся ў пачатку 50-х, калі здолеў выпрацаваць уласны стыль, ізноў жа заснаваны на блюзе, але з актыўным выкарыстаньнем джазавых імправізацый. Пазьней, згодна з просьбамі фірмаў-выдаўцоў, Чарльз быў змушаны пашырыць стылевае кола ўласнай музыкі за кошт сэнтымэнтальных баляд, твораў музыкі кантры. Аднак, што б ён ні выконваў, усё прапускалася праз ягоную незвычайную індывідуальнасьць, пазначаную надзвычайнай экспрэсіяй, самааддачай. Нездарма Рэя Чарльза называюць хросным бацькам стылю соўл, які акрэсьліўся ў канцы 50-х у выніку спалучэньня рытм-энд-блюзу са сьпірычуэламі й госпэламі.

Як і многія іншыя творча апантаныя людзі, не пазьбег Рэй Чарльз наркотыкаў, вось чаму з паловы 60-х ён ужо так і ня здолеў набыць ранейшай папулярнасьці. Хоць запісваўся і выступаў ён па-ранейшаму шмат: дыскаграфія нават асноўных яго альбомаў налічвае звыш за 60 пазыцый.

Найвялікшым ягоным хітом застанецца «Georgia On My Mind» — песьня, якую гэтак выразна, запамінальна мог сьпяваць толькі ўраджэнец Джорджыі, што проста не пасьпеў убачыць іншых краёў, а таму маляваў уласным голасам тое, што бачылася яму ў музыцы.

**Дзьмітры Падбярэскі**

# Асеньні вечар. Адпачываю

Цікавасьць у Беларусі да папулярных жанраў традыцыйнае японскае паэзіі пачалася з Максіма Танка, які, дарэчы, адстойваў адпаведнае паходжаньне свайго псэўданіму — менавіта ад слова «танка». У 1996 г. па-беларуску пад назвай «Круглы год» выйшла й невялікая анталёгія беларускіх хоку. Але прыярытэт першага ў нас аўтарскага зборніку, што цалкам складаецца з твораў «японскіх» жанраў, цяпер належыць Уладзімеру Сіўчыкаву. Натуральна, што, гаворачы пра танка й хоку, створаныя на эўрапейскіх мовах, трэба заўсёды мець на ўвазе, што гэтыя мовы ня ў стане ствараць ані зрокавых, ані слыхавых вобразаў, аналягічных мове японскай. Але ў «эўратанка» ды «эўрахоку» магчыма ўзнавіць усходнюю сузіральнасьць, усходнюю мадэль сьветабудовы: «свет — рух — вынік». Таму ў гэтым зборніку няблага глядзяцца такія рэчы:

Асеньні вечар.
Засунуў юшку ў печы.
Адпачываю…

У прадмове да кніжкі паэт Леанід Дранько-Майсюк выказвае няновую, зрэшты, думку наконт таго, што «творчасьці шкодзіць шматслоўе», і дае азначэньне зборніку як цэласнай зьявы: «каляндарны сшытак», «слоўны памінальнік», «лірычна-прыватны дыярыюш»… Падтрымліваючы гэтую думку, хацеў бы зазначыць, што найцікавей чытаюцца тыя лірычныя карацелькі, у якіх напраўду адчуваецца асоба Ўладзімера Сіўчыкава — літаратара, не абдзеленага талентам жывапісца.

**Лявон Баршчэўскі**



Уладзімер Сіўчыкаў. Высакосны год: Хоку й танка. Менск: Радыёла-плюс, 2004.

ФУТБОЛ

# Чэмпіянат Эўропы на БТ

| Група | каманда | дзень | Час |
|---|---|---|---|
| B | Англія—Швайцарыя | 17 чэрвеня, чацьвер | 18.55* |
| B | Харватыя—Францыя | 17 чэрвеня, чацьвер | 23.30 |
| C | Баўгарыя—Данія | 18 чэрвеня, пятніца | 18.55* |
| C | Італія—Швэцыя | 18 чэрвеня, пятніца | 23.30 |
| D | Латвія—Нямеччына | 19 чэрвеня, субота | 18.55* |
| D | Галяндыя—Чэхія | 19 чэрвеня, субота | 23.25 |
| A | Расея—Грэцыя | 20 чэрвеня, нядзеля | 21.40* |
| A | Гішпанія—Партугалія | 20 чэрвеня, нядзеля | 23.40 |
| B | Швайцарыя—Францыя | 21 чэрвеня, панядзелак | 21.40* |
| B | Харватыя—Англія | 21 чэрвеня, панядзелак | 23.40 |
| C | Італія—Баўгарыя | 22 чэрвеня, аўторак | 21.40* |
| C | Данія—Швэцыя | 22 чэрвеня, аўторак | 23.40 |
| D | Галяндыя—Латвія | 23 чэрвеня, серада | 21.40* |
| D | Нямеччына—Чэхія | 23 чэрвеня, серада | 23.40 |
| 1A— 2B | Чвэрцьфінал | 24 чэрвеня, чацьвер | 21.40* |
| 1B—2A | Чвэрцьфінал | 25 чэрвеня, пятніца | 21.40* |
| 1C—2D | Чвэрцьфінал | 26 чэрвеня, субота | 21.40* |
| 1D—2C | Чвэрцьфінал | 27 чэрвеня, нядзеля | 21.40* |
| 1A/2B—1C/2D | Паўфінал | 30 чэрвеня, серада | 21.40* |
| 1B/2A—1D/2C | Паўфінал | 1 ліпеня, чацьвер | 21.40* |
| | **Фінал** | **4 ліпеня, нядзеля** | |

* Жывая трансьляцыя

## Поль Няўцем

**З 18 да 28 чэрвеня** ў Галерэі мастацтваў (пр.Скарыны, 12) экспануецца выстава твораў мастака Поля Няўцема «…На сьвет зь пятнаццатай прыступкі».

## Мастацтва Ірану

У Палацы мастацтваў **да 20 чэрвеня** можна пагалядзець выставу, прысьвечаную Дням культуры Ірану ў Беларусі. Выстава адбываецца ў фармаце мастацкай майстэрні, непасрэдна перад наведвальнікамі працуюць майстры ў ткацтве дываноў, разьбе па дрэве, драўлянай інкрустацыі, мазаіцы, мініятуры ды інш. Уваход вольны.

## Жорж Санд і ейны час

У Мастацкім музэі **да 1 ліпеня** працуе выстава «Жорж Санд і яе час», прысьвечаная 200-годзьдзю з дня яе народзінаў. Экспануюцца малюнкі, гравюры, літаграфіі.



## Тэатры

**Купалаўскі тэатар**

**25** (пт), **26** (сб) — «Каханьне ў стылі барока».
**27** (ндз) — «КІМ».

**Малая сцэна**

**24** (чц) — «Муж для паэтэсы».
**25** (пт) — «Баляда пра каханьне».

**У Берасьці**

На сцэне Берасьцейскага тэатру драмы і музыкі — гастролі Купалаўскага тэатру: **18** (пт) — «Каханьне ў стылі барока», **19** (сб) — «КІМ», **20** (ндз) — «С.В.», **21** (пн) — «Згублены рай», **22** (аўт) — «Таполевая завея».

**Берасьцейцы ў Купалаўскім**

Гастролі Берасьцейскага тэатру драмы і музыкі: **18** (пт) — «Рэвізія», **19** (сб) — «Рамэо і Джульета», **20** (ндз) — «Кравец», **21** (пн) — «Францускія жарсьці на падмаскоўнай дачы», **22** (аўт) — «Салямэя Русецкая», **23** (ср) — «Беспарадак клясы «Lux», альбо Скокі зь мерцьвяком».

**Опэра**

**19** (сб) — «Вясельле Фігара».
**26** (сб) — Канцэрт з удзелам Натальлі Рудневай, Вікторыі Курбацкай, Алега Мельнікава, Сяргея Франкоўскага.

**Балет**

**17** (чц), **18** (пт) — «Шчаўкунок».
**20** (ндз) — «Эсмэральда».
**22** (аўт) — «Марная перасьцярога».
**23** (ср) — «Макбэт», «Балеро».
**25** (пт) — «Лебядзінае возера».

**Тэатар «Дзе-я?»**

**22** (аўт) — «Ня бойся быць шчасьлівым».
**24** (чц) — «Шалёныя грошы».

**Тэатар «Беларускія сэзоны»**

**23** (ср) — «Сублімацыя каханьня».
**24** (чц) — «Няма такой краіны — Галяндыя…».

**Музычны тэатар**

**20** (ндз) — «Жызэль».
**21** (пн), **22** (аўт) — «Юнона і Авось».
**23** (ср) — «Каралева чардашу».
**24** (чц) — «Дарагая Памэла».

## Канцэрты

**Вітаем Чарлі Паркера!**

**24 чэрвеня** ў Тэатры юнага гледача — канцэрт «Брыль-Бразэрс-Джаз-Квінтэту» зь міжнароднай прэм'ерай «Вітаем Чарлі Паркера!». Пачатак а 19-й.

**Моладзевы тэатар эстрады**

**22** (аўт) — «Легенды Вялікага Княства». Medieval music. «Полацкі сшытак» і іншыя творы эўрапейскай музыкі. Contredance Lituus.

**Заля камэрнай музыкі**

**18** (пт) — канцэрт арганнай музыкі.
**21** (пн) — цыкл канцэртаў «Настаўнікі і вучні». Кляса Ю.Гільдзюка.
**22** (аўт) — музычная гасьцёўня.
**25** (пт) — канцэрт арганнай музыкі.

## Клюбнае жыцьцё

**Bronx**

**17** (чц), 22.00 — клюбны чацьвер: dj Laurel.
**18** (пт), 22.00 — «Live Jazz»: Svet boogie band.
**19** (сб). 22.00 — «Bronx Birthday party»: dj Spy.der, Ігар Бутман (Jazz).

**Белая Вежа**

**17** (чц), 22.00 — «White Tower party»: dj Top & dj Grizzly. Квіткі: 5000.
**18** (пт), 22.00 — dj Mixell (europop), go-go.
**19** (сб), 22.00 — «Вечар Гаваны». Кубінскія танцы, жывая музыка, шоў бармэнаў, кактэйлі «Havana Club».
**20** (ндз), 22.00 — dj Alex, dj Dee(europop), go-go.

**Гудвін**

**17** (чц), 21.00 — акустычны канцэрт групы «Крама».
**18** (пт), 21.00 — жывая музыка: джаз трыё «N.C.».
**19** (сб), 21.00 — жывая музыка: «Мадэра Хард Блюз».

**X-Ray**

**18** (пт), 22.00 — dj Grizzly.
**19** (сб), 22.00 — dj Noche.

**Ямайка**

**18** (пт), 21.00 — Preparty + Afterparty.
**19** (сб), 3.00 — Afterparty.

**Presto**

**19** (пт), 22.00 — «Jetsounds Cosmic Corp. Summerphonia», dj Partyphone («Прапаганда», Масква), dj Arsenti Tchouprina. Квіткі: 15000, папярэдне — 12000. Т.: 777-14-24, 772-37-22.

**Графіці**

**22** (аўт) — канцэрт аўтара-выканаўцы Аляксандра Баля. Т.: 758-40-54.

## Кінаафіша

**«Аўрора»** (253-33-60)
«Ван Хельсынг»**** (прэм'ера): **18, 19** (пт, сб) 13.30, 16.00, 18.30, 20.50; **20** (ндз) 12.40 (іл), 19.00, 21.20.
«Гары Потэр і вязень Азкабану»: **18—20** (пт—ндз) 10.20 (іл), 13.00, 15.40.
«Хто забіў Бэмбі?»**** («Кінафармат 4x4»): **18** (пт) 18.50, 21.00.
«Боўлінг для Калумбіны»**** («Кінафармат 4x4»): **19** (сб) 18.50, 21.00.
«Кропкі над «і»*** («Кінафармат 4x4»): **20** (ндз) 18.50, 21.00.
**«Берасьце»** (272-87-91)
«Троя»: **18** (пт) 14.00, 17.15, 20.30; **19, 20** (сб, ндз) 14.00 (іл), 17.15, 20.30.
**«Дружба»** (240-90-13)
«Гары Потэр і вязень Азкабану»: **18** (пт) 10.30, 17.30, 20.00; **19, 20** (сб, ндз) 13.00 (іл), 17.30, 20.00.
**«Кастрычнік»** (232-93-25)
«Ван Хельсынг»**** (прэм'ера): **18** (пт) 15.40, 18.20, 21.00; **19, 20** (сб, ндз) 15.40 (іл), 18.20, 21.00.
**«Масква»** (223-27-10)
«Ван Хельсынг»**** (прэм'ера): **18** (пт) 16.00, 18.30, 21.00; **19** (сб) 13.30, 16.00, 18.30, 21.00; **20** (ндз) 13.30 (іл) 16.00, 18.30, 21.00.
**«Мір»** (288-22-33)
«Троя»: **18** (пт) 13.30 (іл), 21.00; **19, 20** (сб, ндз) 13.30, 21.00.
«Кропкі над «і»*** («Кінафармат 4x4»): **18** (пт) 16.30, 18.40.
«Далёкае сьвятло»*** («Кінафармат 4x4»): **19** (сб) 16.30, 18.40.
«Хто забіў Бэмбі?»**** («Кінафармат 4x4»): **20** (ндз) 16.30, 18.40.
**«Перамога»** (223-77-66)
«Брудныя танцы-2»***: **18** (пт) 14.00.
«Боўлінг для Калумбіны»**** («Кінафармат 4x4»): **18** (сб) 16.00, 18.40, 21.10.
«Хто забіў Бэмбі?»**** («Кінафармат 4x4»): **19** (сб) 16.00 (іл), 18.40, 21.10.
«Далёкае сьвятло»*** («Кінафармат 4x4»): **20** (ндз) 16.00 (іл), 19.00, 21.20.
**«Піянер»** (227-64-87)
«Няват ня думай-2: цэнь незалежнасьці»: **18** (пт) 17.00, 21.00; **19, 20** (сб, ндз) 17.20, 21.00.
«А вось і Полі»: **18** (пт) 19.00; **19, 20** (сб, ндз) 15.45, 19.10.
**«Цэнтральны»** (220-34-16)
«Гары Потэр і вязень Азкабану»: **18** (пт) 11.00; **19** (сб) 11.00, 14.00, 16.30; **20** (ндз) 12.00, 15.00.
«Карабель «Анжэліка» (Дні іранскага кіно): **18** (пт) 20.00.
«Далёкае сьвятло»*** («Кінафармат 4x4»): **18** (пт) 15.20, 17.40.
«Кропкі над «і»*** («Кінафармат 4x4»): **19** (сб) 19.00, 21.00.
«Боўлінг для Калумбіны»**** («Кінафармат 4x4»): **20** (ндз) 18.00, 20.30.

(іл) — ільготны сэанс (скідка 50% для ўсіх гледачоў)

Рэйтынгавыя абмежаваньні:
*** — дзеці да 16 год не дапускаюцца;
**** — дарослым з 18 год.

## Дзя дзетак

**Тэатар «Дзе я?»**

**22** (аўт) — «Чароўная скрыпка».
**23** (ср) — «Зачараваная прынцэса».
**24** (чц) — «Новыя прыгоды старых знаёмых».

**Музычны тэатар**

**20** (ндз) — «Бураціна.by».

**У Купалаўскім**

**19** (сб), **20** (ндз) — «Парася Кнок». Спэктакль паказвае Берасьцейскі тэатар драмы і музыкі.

**Кінатэатры**

**«Аўрора»**
«Кевін у краіне Драконаў»: **18** (пт) 10.30; **19, 20** (сб, ндз) 11.00.
**«Берасьце»**
«У пошуках Нэма»: **18** (пт) 10.30; **19, 20** (сб, ндз) 11.50.
**«Мір»**
«Агент Кодзі Бэнкс»: **18** (пт) 10.30.
«Дзеці шпіёнаў-3D: гульня скончана»: **19, 20** (сб, ндз) 11.30.
**«Перамога»**
«Тайна Блакітнай лягуны»: **18** (пт) 11.00; **19, 20** (сб, ндз) 14.00.
**«Піянер»**
«Дзеці шпіёнаў-2»: **18** (пт) 12.20; **19, 20** (сб, ндз) 14.00.
«Блізард»: **18** (пт) 10.20; **19, 20** (сб, ндз) 12.10.
«Пітэр Пэн у Нідзеляндыі»: **18** (пт) 14.20; **19, 20** (сб, ндз) 10.20.

КІНО Ў МЕНСКУ

# Не страляйце ў гледачоў

## у «Кінафармаце 4x4»

«Боўлінг для Калумбіны» («Bowling for Columbine») ЗША, 2002, каляровы, 114 мін.
**Жанр:** Дакумэнтальнае расьсьледаваньне-сатыра.
**Адзнака:** 8,5 (з 10).



Дакумэнтальны фільм Майкла Мура, папярэднік уляўраванага ў Канах «11 верасьня па Фарэнгейту». Трагічны інцыдэнт у каледжы Калумбіны, калі падлеткі перастралялі сваіх аднаклясьнікаў, паслужыў зыходным пунктам для рэжысэрскага расьсьледаваньня. Чаму так адбываецца? Хто ці што за гэтым стаіць? Галівуд, рок-музыка, расавая нянавісьць? А мо амэрыканцы гістарычна схільныя да гвалту?

Калі гледачы вырашаць, што дакумэнтальная карціна, ды яшчэ на далёкую ад іх тэму, будзе нецікавая, то яны памыляюцца. Майкл Мур бярэ ў абарот з першых кадраў і не адпускае да апошняй хвіліны. Бліскучы талент апавядальніка, дынамічны мантаж, нечаканыя й панарамныя сьведчаньні — і інтанацыя, прасякнутая болем, любоўю і атрутнай іроніяй.

Як ні дзіўна, неігравая стужка Майкла Мура часам нагадвае сатырычны шэдэўр Стэнлі Кубрыка «Доктар Стрэнджлаў», але Мур — сам удзельнік і сьведка абсурднай рэчаіснасьці, калі маральная крывадушнасьць прытуляецца да зброі, а эгаізм спараджае страх і забойствы.

Калі раптам аглядальнікі БТ вырашаць, што яны таксама дакумэнталісты-сатырыкі, дык ізноў жа памыляцца: ім да Майкла Мура — як да Альфа Цэнтаўры пешкі. Амэрыканскі рэжысэр, у адрозненьне ад іх, людзей любіць — і ён яшчэ адказны й таленавіты.

Фільм проста абавязковы для прагляду палітыкам, грамадзкім і культурным дзеячам. Але й любы іншы глядач ацэніць гэтае палкае, глыбокае — і відовішчнае кіно.

**Андрэй Расінскі**

## НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

**Акудовіч В. Разбурыць Парыж.** — Менск: Логвінаў, 2004. — 298 с. 300 ас.

Сабраныя ў зборніку з ваяўнічай назвай тэксты друкаваліся на працягу апошніх гадоў у розных айчынных і замежных выданьнях. У кнізе зьмешчаны эсэ «Віртуальная Беларусь», «Вандэя, альбо Свабода як форма выяўленьня волі да ўлады», «Нідзе й ніхто», «Разбурыць Парыж», «Росквіт і занепад мэтафізыкі», «Фрагмэнты страчанага гіпэртэксту». Пытайцеся на выставе ў БНФ.

**Ніна Баршчэўская. Беларуская эміграцыя — абаронца роднае мовы.** Варшава, друкарня MWM, 2004.

Сакрат Яновіч піша пра гэтую кнігу: «Надзвычай багатая дакумэнтацыя гэтай кнігі імпануе гігантскаю працай, зробленай беларусамі на чужыне, насуперак савецкім уладам, якія ставілі сваёй мэтаю зьнішчажэньне нацыянальнай Беларусі, ператварэньне яе ў расейскамоўную правінцыю Крамля. Кніга доктаркі Баршчэўскай — гэта настольная кніга, якая чытаецца ды перачытваецца як заўсёды патрэбная».

**Беларуская літаратура:** Хрэстаматыя / Уклад. У.Адамчык, М.Адамчык. — Менск: Сучасны літаратар, 2004. — 1008 с. 5100 ас.

Дзякуючы вялікаму фармату ды цьвёрдай каляровай вокладцы, гэтае выданьне выглядае вельмі самавіта й адразу прыцягвае ўвагу ў кнігарні. Хрэстаматыя ўвабрала дзясяткі ўзораў прыгожага пісьменства ад старажытнасьці да сёньня. Арыгінальна падышлі ўкладальнікі да сыстэматызацыі матэрыялу: імі вылучаны разьдзелы па эпохах і кірунках («Старажытная літаратура Русі», «Адраджэньне», «Барока. Клясыцызм. Асьветніцтва», «Рамантызм»), а ў дачыненьні да ХХ ст. творы згрупаваны паводле найбуйнейшых літаратурна-мастацкіх выданьняў, зь якімі зьвязаная дзейнасьць таго ці іншага аўтара («Літаратары «Нашай Нівы», «Літаратары «Ўзвышша», «Полымя», «Маладосці», «Крыніцы», а таксама «Філялягічнае пакаленьне»). Адно што пры такім падыходзе сустракаюцца недарэчнасьці: у разьдзеле «Рамантызм», напрыклад, на роўных правах зьмешчаны тэксты А.Міцкевіча, Я.Баршчэўскага, В.Дуніна-Марцінкевіча ды Ф.Багушэвіча. Найноўшая літаратура прадстаўлена пераважна паэтамі — Нінай Мацяш, Яўгеніяй Янішчыц (цяжка пагадзіцца, што яна «літаратар «Крыніцы»), Алесем Разанавым, Адамам Глёбусам. Закрываюць хрэстаматыю творы Анатоля Сыса. Цана выданьня ў кнігарнях блізу 11000 руб.

**Смалянчук А. Паміж краёвасьцю й нацыянальнай ідэяй: Польскі рух на беларускіх і літоўскіх землях (1864—люты 1917 г.)** / Бел. гіст. т-ва. — 2-е выд., дапр. — Санкт-Пецярбург: Неўскі прасьцяг, 2004. — 406 с. 500 ас.

У манаграфіі, першае выданьне якой выйшла ў 2001 г., дасьледуецца гісторыя палякаў на землях былога ВКЛ. Асобны разьдзел прысьвечаны разглязу стаўленьня польскай грамадзкасьці да беларускага й літоўскага адраджэньня ды стаўленьня дзеячоў беларускага руху да нацыянальна-культурнай дзейнасьці беларускіх і літоўскіх палякаў. У «Акадэмкнізе» цана 9600 руб.

**Цімохін Л. Срэбны коньнік:** Вершы. — Менск, 2003. — 160 с. 500 ас.

Аўтар кнігі — не прафэсійны літаратар, а гісторык. Пра яго як творцу й беларуса піша ў прадмове Алесь Мара.

**Contemporary Changes in Belarus.** Baltic and East European Studies 2. Södertörns högskola, 2004. —112 с.

Зборнік матэрыялаў сэмінару «Перамены ў сучаснай Беларусі», што адбыўся ў Балтыйска-ўсходнеэўрапейскай вышэйшай школе ў швэдзкім унівэрсытэце Садэрторнз. Розныя па якасьці артыкулы закранаюць палітыку (Дэвід Марплз, Ганна Бжазоўская), гісторыю (Андрэй Катлярчук) і нацыянальную ідэнтычнасьць (Барбара Торнквіст-Плева) Беларусі ды адлюстроўваюць сучасны стан сусьветнае беларусістыкі.

**Internationale politic.** Распад государств и укрепление государственности. №:6. 2003.

**Тацяна Вабішчэвіч**

# Напачатку быў пратэст

Для кожнага сярэднеэўрапейскага народу стварэньне сваёй нацыянальнай опэры было сьведчаньнем паўнавартаснасьці нацыі. Першая літоўская опэра прагучала ў 1906 годзе, украінская — у 1863, беларуская — у 1852, польская — у 1778. У чэхаў будынак опэрнага тэатру двойчы гарэў, і двойчы ўвесь народ зьбіраў па кроне, каб яго адбудаваць.

**13 чэрвеня ў Менску на плошчы Свабоды пад гукі ратушнага гадзіньніка ўдзельнікі абароны менскай опэры прыгадвалі падзеі 20-гадовай даўніны.**

13 чэрвеня, 13 чалавек, будынак Цэнтральнага РАУС, збудаваны ў 1913-м… Гісторыя грамадзянскай актыўнасьці ў Менску пачыналася як дзіцячая страшылка.

13 чэрвеня 1984 г. студэнтка кансэрваторыі Ларыса Сімаковіч (цяпер кіраўніца фольктэатру «Госьціца») ішла на сьпеўкі «Майстроўні», якія адбываліся ў Палацы прафсаюзаў. Яна ўбачыла, што будынак опэры абнесены плотам і яго зьбіраюцца руйнаваць. Яна пасьпяшалася ў «Майстроўню», і ўсе трынаццаць удзельнікаў сьпевак пабеглі на вуліцу пратэставаць.

Ідэя пра абарону будынку лунала ў паветры. Нейкі час будынак стаяў у рыштаваньнях і была пагалоска, што яго будуць рэстаўраваць. Потым зьявіліся артыкулы, дзякуючы якім грамадзкасьць даведалася, што будынак будуць зносіць. Тыя ж «майстроўцы», студэнты ВНУ арганізавалі збор подпісаў у абарону будынку, але гэта не дапамагло.

Калі «майстроўцы» прыйшлі на месца падзеі, там ужо быў тлум разявак. Балазе паглядзець было на што: будынак бурылі чыгуннай бабай, стаяў неймаверны грукат, пыл ляцеў ва ўсе бакі. Будынак рассыпаўся на вачах. Пад разьмераныя ўдары чыгуннай бабы «майстроўцы» пачалі скандаваць: «Руйнуецца помнік гісторыі!» Была шостая вечара, але міліцыянты казалі ўдзельнікам акцыі, што яны замінаюць жыхарам спаць. Тады вырашылі выказаць пратэст візуальна, і мастак Алесь Костка лётам намаляваў плякат «Руйнуецца помнік гісторыі». «Мы тады ня надта ведалі, што значыць выйсьці на вуліцу. Мы ня ведалі ні Адміністрацыйнага, ні Крымінальнага кодэксаў, мы наіўна слухаліся міліцыянтаў. Шмат што было наіўна», — кажа ўдзельнік падзей Вінцук Вячорка.

З таксафона Алесь Марачкін і Мікола Купава спрабавалі патэлефанаваць каму-небудзь з чыноўнікаў. Але быў канец працоўнага дня, і нікога з адказных асобаў не было на працы.

Міліцыянты пачалі затрымліваць хлопцаў (першым Вінцука Вячорку, якога, быццам вялікага начальніка, пасадзілі ў чорную «Волгу»), а дзяўчаты з салідарнасьці самі залезьлі ў «козлік». Іх усіх завезьлі ў пастарунак (Цэнтральны РАУС на Інтэрнацыянальнай), дзе «майстроўцы» няблага прабавілі час, сьпяваючы песьні (прасьпявалі ўвесь рэпэртуар, прызначаны на сьпеўкі) і жартуючы зь міліцыянтаў. РАУС разьмяшчаўся ў гістарычным будынку 1913 г., і на закіды пра абарону гістарычнай спадчыны міліцыянты адказвалі: маўляў, самі паспрабавалі б папрацаваць у гістарычным будынку, дзе кепская вэнтыляцыя. З удзельнікаў акцыі міліцыянты пачалі браць тлумачэньні. Запісаўшы асабовыя зьвесткі, сьледчыя некуды тэлефанавалі і дыктавалі запісаную інфармацыю пра затрыманых, дзе яны, відавочна, былі добра вядомыя. «Тады я зразумеў, што мы жывём у паліцэйскай дзяржаве», — прыгадвае Зьміцер Саўка.

Начальнік РАУС нават адпусьціў Ларысу Сімаковіч дахаты пакарміць 7-месячнае дзіця. Яе муж адрэагаваў на гісторыю з пастарункам экспромтам: «Ах, дэлегатка, як табе ня гадка». Ларыса сумленна вярнулася ў пастарунак, прыхапіўшы з сабою хлеб з салам. Кавалак сала яна захавала да гэтага часу. На ўсіх «майстроўцаў» склалі пратаколы, а ўночы пачалі адпускаць дахаты.

Зьміцер Саўка прыгадвае, што назаўтра пасьля падзеі пачалося зусім іншае жыцьцё. У навучальных установах усіх удзельнікаў акцыі выклікалі ў аддзелы КДБ, папярэджвалі пра магчымыя меры. Артуру Клінаву пагражалі выключэньнем з інстытуту. Некага з удзельнікаў начальства выхоўвала: «Што вы нарабілі? А калі б пра гэта перадалі варожыя галасы?!» Ці перадалі галасы — невядома, але з таго часу кожны мовазнаўчы артыкул Вінцука насілі ў КДБ на вычытку.

«Атмасфэра ў «Майстроўні» памянялася, на наступны сход прыйшло значна менш людзей. Страх і асьцярога супалі зь летнімі вакацыямі, і ўлетку «Майстроўня» як вялікі клюб спыніла сваё існаваньне, засталіся толькі сьпеўныя гурты, якія працягвалі зьбірацца», — кажа Вінцук Вячорка. «Акцыя 13 чэрвеня — гэта была вельмі выразная, якасная мяжа. Тое сьветаадчуваньне, якое сьпялілася ў беларускай нацыянальна сьвядомай моладзі, вылілася на вуліцу. І для мяне асабіста гэта азначала яўную, відавочную палітызацыю. Клюб «Талака», які ўзьнік пасьля «Майстроўні», часткова з тымі ж удзельнікамі, быў значна больш палітызаваны. Гэта азначала новую якасьць беларускага грамадзтва ў цэлым: пройдзе ўсяго два гады, і на пляцы Волі адбудзецца мітынг за аднаўленьне Ратушы, базыльянскага кляштару, Верхняга гораду. А потым ужо былі Курапаты і г.д. І гэта вельмі знакава, што першы выхад беларусаў на вуліцу пасьля вайны менавіта ў сталіцы быў за беларускую культуру і гісторыю».

На сустрэчу 13 чэрвеня праз 20 гадоў прыйшлі ня толькі героі падзеі, але і іншыя «майстроўцы». 20 год пасьля дня абароны будынку менскай опэры ўсе правялі па-рознаму. Нехта зьехаў за мяжу, нехта па-ранейшаму кантактуе міжсобку. Разам сьвяткуюць народныя сьвяты, разам наведваюць канцэрты Ларысы Сімаковіч. Цяпер удзельнікі тагачаснай акцыі вырашылі сустракацца штогадова. Дый нагодаў для гэтага хапае.

**Вераніка Дзядок**




**На здымку 13 чэрвеня 2004 г.: лідэр БНФ Вінцук Вячорка, кіраўніца «Госьціцы» Ларыса Сімаковіч, лінгвіст Зьміцер Саўка.**

## Сьпіс 13 удзельнікаў пратэсту 1984 г.:

Ларыса Сімаковіч, Зьміцер Саўка, Артур Клінаў, Алесь Костка, Вінцук Вячорка, Віялета Кавалёва, Васіль Матусевіч, Яна Міхайлава, Лада Шчасная, Юля Лыскова, Марына Лычкоўская, Алена Клімовіч, Ігар Міклашэвіч.




Сяргей Харэўскі

# Драма ня скончылася

Старасьвецкі будынак гарадзкога тэатру быў адной з самых славутых цікавостак Менску. Паўстаў ён яшчэ ў XVIII ст. Самую раньнюю яго выяву мы ведаем паводле акварэлі Язэпа Пешкі. На ёй у панараме Высокага пляцу, за Ратушай, відаць імпазантны двухпавярховы будынак з рызалітам, што вянчаўся трохкутным франтонам і высокім вальмавым дахам.

Вядома, што паміж 1815 і 1818 г. яго прыдбаў шляхціц Ян Байкоў. Ён выгодна прыстасаваў гэты вялікі будынак пад карчму з канцэртнаю заляю. У 1821 г. будучы дзекабрыст Мікалай Мураўёў у лісьце са службы да сваёй мамы пісаў: «Зімою абяцаюць нам балі. Заля ў тутэйшай карчме, у якой яны даюцца, вельмі добрая». А ў 1825 г. Байкоў самахоць перабудаваў будынак пад тэатар. У выніку паўстаў выдатны гмах у духу ампіру.

Калярытнае й жывое апісаньне менскага тэатру можна знайсьці ў лісьце Яна Чачота да Адама Міцкевіча. Як мае быць, акрамя вялікай глядзельнай залі будынак зьмяшчаў гардэроб, буфэт, антрактавую залю й пакой для курцоў. Пасьля таго як на загад расейскага цара была ў Менску зьнішчана Ратуша, у колішні дом Байкова перавялі й гарадзкі тэатар.

У 1841 г. тут адбылася прэм'ера апэрэты Дуніна-Марцінкевіча «Жыдоўскі рэкруцкі набор». Але самая вялікая падзея надарылася ў тым гарадзкім тэатры ў 1852 годзе, калі на яго сцэне была пастаўленая першая нацыянальная беларуская опэра «Ідылія» зь лібрэта Дуніна-Марцінкевіча й на музыку Манюшкі ды Крыжаноўскага. Уласна, з гэтага моманту гэты будынак зрабіўся сапраўднай нацыянальнай рэліквіяй.

Пасьля пажару 1884 г. будынак тэатру быў рэканструяваны, у выніку чаго моцна зьмяніў сваё аблічча. Пры канцы XIX ст. будынак быў набыты Пецярбурска-Азоўскім камэрцыйным банкам. У выніку рэканструкцыяў 1930-х гадоў быў надбудаваны чацьвёрты паверх. А ў 1984 г. будынак, замест рэстаўрацыі, быў зьнішчаны. Фармальнай нагодай была «рэканструкцыя» з мэтаю «добраўпарадкаваньня». Стыхійны пратэст моладзі, што памкнулася літаральна сабою захінуць сьвятыню, быў марным. Камуністычная прэса прысьвяціла падзеі нямала месца з мэтаю давесьці, што гэты помнік — зусім і ня помнік. Маладых жа патрыётаў бэсьцілі на ўсе лады. У Менскай мастацкай вучэльні быў праведзены нават адмысловы камсамольскі сход, на якім зьбянтэжаныя навучэнцы з вуснаў камсамольскага сакратара Марцінкевіча дазналіся, што клясык Дунін-Марцінкевіч апяваў клясавы мір і ідэалізаваў прыгон.

Ад былой беларускай сьвятыні ацалеў адно ажурны літы гаўбец з выявамі вершніка на кані ў абрамоўцы вінаградных гронак. І… падмуркі, якія высілкамі адмысловаў былі ўзятыя пад ахову.

На аснове дасьледаваньняў Уладзімера Дзянісава архітэктар Зьміцер Бубноўскі зрабіў навуковую рэканструкцыю будынку колішняга тэатру. У стылі ампір, гэтак, як ён выглядаў у часы Дуніна-Марцінкевіча й Манюшкі. Гэта дае падставы для навукова абгрунтаванага ўзнаўленьня нашага першага тэатру на саміх яго падмурках. Дакладна на тым самым месцы. Дакладна ў тых самых формах. І праект такі ўжо гатовы. І вядома яго прызначэньне — пад камэрную музычную залю для Кансэрваторыі.

Але цяпер ужо й над падмуркамі колішняга тэатру навісла пагроза. Калі ўсё ж будзе прынята рашэньне на гэтым месцы пабудаваць гатэль, мы назаўжды разьвітаемся зь імі. Прэтэнцыёзная ідэя адбудаваць гатэль «Эўропа» ня ў тым месцы, ня ў тых формах і ня ў тых матэрыялах яшчэ не пахаваная.

# Што беларусу даспадобы, для швэда — звычайная зьява

**Карэспандэнт «НН» правёў тыдзень у Швэцыі.**

Навучальная ўстанова, якую мы наведалі, месьціцца ў Кронабэргу — маляўнічым мястэчку ля гораду Вэкшэ, і ўяўляе сабой тыповую эўрапейскую пабудову: кампактныя архітэктурныя рашэньні ды ўсе сучасныя выгоды. Назва яе ў даслоўным перакладзе гучыць наступным чынам: «Народная школа імя сьвятога Зыгфрыда». «Народная» — бо разьлічана на даступнасьць для розных катэгорый насельніцтва, перш за ўсё небагатага (калі да жыхароў Швэцыі гэтае азначэньне ўвогуле можна ўжываць) і сярэдняй клясы. «Сьвятога Зыгфрыда» — бо адчувае ўплыў лютэранскай царквы.

Гэткі тып «народных» школ папулярны ў Швэцыі. На тэрыторыі краіны месьціцца 147 аналягічных установаў. А ідэя іх стварэньня прыйшла з Даніі, дзе ўпершыню яны пачалі зьяўляцца яшчэ ў XIX ст.

У такой школе вучыцца 150—200 чалавек. Кожны месяц бацькі навучэнцаў выплачваюць астранамічную па беларускіх мерках суму — 7000 крон (каля тысячы даляраў). Гэта роўна траціна швэдзкага сярэднямесячнага заробку, які складае 21 тысячу крон. Цікава зазначыць, што студэнты плацяць за падручнікі, чатырохразовае харчаваньне, карыстаньне пакоямі, Інтэрнэтам, спартовымі прыладамі, шматлікімі лябараторыямі, але ніяк не за навучаньне. Адукацыя ў Швэцыі цалкам бясплатная, таму студэнтца плаціць толькі за пералічаныя выгоды.

## Жыцьцё пры адчыненых дзьвярах

Атмасфэра ў школе вызначаецца нязвыклымі нефармальнасьцю ды свабодай. Ва ўяўленьні беларуса любая навучальная ўстанова — гэта перш за ўсё пэўныя правілы і патрабаваньні, якія патрабуюць няўхільнага выкананьня, ды строгія нормы паводзінаў, што не вылучаюцца з агульнапрынятых абмежаваньняў. Школа сьвятога Зыгфрыда парушыла ўсе мае ўяўленьні аб гэткага роду ўстановах.

Стасункі навучэнцаў з выкладчыкамі не вызначаюцца афіцыёзам. Папершае, зьвяртаючыся да настаўнікаў, студэнты заўсёды выкарыстоўваюць толькі імя. Па-другое, вітаюцца з выкладчыкамі традыцыйным швэдзкім «хэй» (нешта накшталт беларускага «здароў»). Па-трэцяе, у размовах зь імі моладзь трымаецца гэтак жа разьняволена, як і ва ўласным коле. Выкладчыкі таксама адказваюць нязмушанасьцю. (Студэнты з выкладчыкамі могуць за адным сталом папіваць піва).

Гэткія сяброўскія адносіны, з аднаго боку, відавочна спрыяюць лепшаму засваеньню ведаў ды зьяўляюцца важным складнікам навучальнага працэсу. Аднак разам з тым у Швэцыі паўстае адваротная праблема. Калі навучэнец чацьвёртай клясы, прыходзячы на занятк, кажа настаўніку: «Здароў, што чуваць?» — міжволі ўзьнікае пытаньне аб належнай павазе да выкладчыка.

Дадаюць нефармальнага каларыту сьнеданьні ды абеды, якія таксама заслугоўваюць асобнай размовы. Складальнікамі мэню зьяўляюцца самі студэнты, якія выбіраюць з прапанаваных страў ды напояў упадабаныя, вызначаюць іх памер ды абслугоўваюць кожны сам сябе — тыповы прыклад сусьветна вядомага швэдзкага стала. Есьці можна колькі ўлезе (ужо ж — тысяча даляраў за пансіён), трэба толькі не спазьняцца. Часьцяком моладзь прыхоплівае талеркі ды накіроўваецца на футбольнае поле, дзе ўладкоўваецца на зялёнай траве і пачынае з дзвайным апэтытам зьнішчаць прыгатаваную ежу.

Агульнавядома, што Швэцыя — краіна, што мае адзін з самых нізкіх узроўняў злачыннасьці. Гэтая акалічнасьць значна ўплывае на побыт школы. Са спартовай пляцоўкі ніколі не прыбіраюцца футбольныя ды баскетбольныя мячы, дзьверы пакояў рэдка замыкаюцца, вэлясыпэды — дарэчы, вельмі папулярны від транспарту — пакідаюцца ў любым прыдатным для гэтага месцы без замкоў.

Нарэшце, школа мае ўласны сайт у Інтэрнэце, спэцыяльна выпрацаваны з сымболікай нататнікі, ручкі і нават сурвэткі ў сталовай. Затое няма адзнак, залікаў ды іншых спосабаў кантролю ведаў навучэнцаў. Праграма навучаньня разьлічана на падрыхтоўку моладзі да паступленьня ва ўнівэрсытэт. Таму выкладчыкі палічылі залішнім неяк стымуляваць працэс адукацыі, у якім і бяз гэтага студэнты непасрэдна зацікаўленыя.



Швэды ўсё будуюць з дрэва. Студэнцкі пансіянат у Кронабэргу. Будынкі, як амаль паўсюдна ў швэдзкай правінцыі, пафарбаваныя ў бурачны колер.

## Чыноўніцтва на далоні

Адчынены ў швэдзкай структуры грамадзтва ня толькі дзьверы. Гэткай жа даступнасьцю вызначаюцца падыходы да атрыманьня інфармацыі. Будучым журналістам можна толькі пазайздросьціць. Кожны жадаючы, незалежна ад нацыянальнай прыналежнасьці (сам правяраў), мае права прыйсьці ў мясцовыя органы ўлады і запатрабаваць неабходныя зьвесткі. Калі хадайнік ня ведае швэдзкай мовы, служачыя павінны зрабіць пераклад ці выдаць дублікат на ангельскай. Не зьяўляюцца перашкодай і абмежаваныя фізычныя магчымасьці. Супрацоўнікі муніцыпалітэту ў Вэкшэ (райвыканкам па-нашаму) паведамілі, што часьцяком вымушаны чытаць па 2—3 гадзіны пэўны закон альбо пастанову грамадзянам, што страцілі зрок.

Пры замове інфармацыі адказ павінен прыйсьці на працягу дня. За ўтойваньне зьвестак чыноўнікам альбо служачым пагражае два гады пазбаўленьня волі.

Жыцьцё палітыкаў розных узроўняў знаходзіцца пад пільным вокам насельніцтва, за выключэньнем, мабыць, толькі прыватнай сфэры, абсягі якой таксама паступова звужаюцца. Так, у муніцыпалітэце можна даведацца пра памер зарплаты любога дзяржслужбоўца, атрымаць падрабязныя зьвесткі пра ягоную маёмасьць (ажно да памеру кватэры ці назвы аўтамабіля) альбо дазнацца пра месца, дзе гэты служачы сёньня сьнедаў ці абедаў, якую ежу прымаў, колькі грошай за яе выклаў — ёсьць магчымасьць нават атрымаць копію чэка!

## Эўрапейскія выдумкі і ўласныя інтарэсы

Што да інтарэсаў швэдзкіх студэнтаў, то тут у кожнага сваё хобі.

Практычна ў кожнага — магутная вежа самых розных кампактдыскаў: пачынаючы ад мэталу, працягваючы прыпанкаваным «Offspring», швэдзкімі «Cardigans» і «Roxette» і заканчваючы клясыкай.

З расейскіх пісьменьнікаў студэнцтва ведае Талстоя, Дастаеўскага ды Булгакава (пры гэтым толькі адзін чалавек змог больш-менш зразумела патлумачыць зьмест аднаго з твораў, распавёўшы пра «Майстра і Маргарыту»), а зь беларускіх дзеячоў, сарамяжліва адводзячы ўбок позіркі, моладзь прыгадала толькі працу Андрэя Катлярчука «Швэды ў гісторыі й культуры беларусаў».

А што славутая швэдзкая сям’я? Скандынавы замест адказу аджартоўваліся: маўляў, хлусьня гэта ўсё — прыдумка эўрапейцаў (зрэшты, як і тое, што ўсе швэды — бляндыны з блакітнымі вачыма). Аб чым сьведчылі і закаханыя пары, якія ўвечары нясьпешна шпацыравалі вакол школьных будынкаў.

## У нагу з часам

«Не сказаць, каб я моцна ганарыўся тым, што я швэд», — так пачаў гаворку школьны настаўнік Фрэдрык на адным з сумесных заняткаў. Падаецца, выкладчык крыху схлусіў. Мо хтосьці са швэдаў і не надзвычай задаволены сваёй нацыянальнай прыналежнасьцю, але гэта ніяк не зьмяншае нацыянальнага пачуцьця ды павагі да краіны. Практычна ля кожнага доміка лунае ў паветры невялікі сьцяг, дарожныя знакі маюць жоўта-блакітную афарбоўку, у гэтым жа стылі распрацаваны дызайн большай часткі швэдзкіх памяшканьняў — жоўтае адценьне дрэва ды прывабныя фатэлі абавязкова сіняга або блакітнага колеру.

Дарэчы, прыхільнасьць швэдаў да дрэва ўражвае: у Вэкшэ ўзьведзены новы корпус унівэрсытэту, які адпавядае самым сучасным патрабаваньням, — найбольшы будынак у Эўропе, зроблены выключна з дрэва.

Што маецца на ўвазе пад сучаснымі прыладамі, патлумачу на прыкладзе факультэцкай бібліятэкі. Скарбніца ведаў, дзе студэнты рыхтуюцца да заняткаў, мае пакоі «гучныя» (дзе дазваляецца размаўляць уголас) і «ціхія», групавыя, дзе можна працаваць разам зь сябрамі, ды кампутарныя — калі ёсьць патрэба рабіць працу ў электронным выглядзе.

Каб атрымаць падручнік, неабходна проста правесьці яго пад спэцыяльным кампутарам на выхадзе, які счытвае ўсю інфармацыю і заносіць кнігу на асабістую картку. Таму ў бібліятэцы ніколі не бывае чэргаў.

Акрамя таго, існуе сыстэма швэдзкага каталёгу. Навучэнец мае магчымасьць замовіць кнігу, якой няма ў бібліятэцы, зь любога кутка краіны. Яна будзе даставлена на працягу двух дзён.

Швэдзкае наватарства робіць побыт прыемнейшым, але набывае часам гумарыстычнае адценьне. Каля драўлянага будынку факультэту месьціцца невялікі замак, прыгожы сваёй старадаўняй таямнічасьцю. Уявіце сабе, якое зьдзіўленьне панавала на нашых тварах, калі мы даведаліся, што гэты замак пабудаваны восем год таму, адмыслова стылізаваны пад мінуўшчыну, а жывуць у ім звычайныя выкладчыкі!

## Дэмакратыя па-швэдзку

Прэса ў Швэцыі — сапраўдная чацьвертая ўлада, цалкам незалежная ад ураду. Вось тыповы прыклад. У лютым швэдзкі кароль (ягоная ўлада сымбалічная) наведаў Брунэй, дзе падчас візыту надзвычай хваліў султана ды дасягненьні краіны ў галіне дэмакратыі. Між тым усе крытыкі наяўнага рэжыму ў Брунэі сядзяць за кратамі. У газэтах адразу ж узьнялася хваля абурэньня. Кароль і раней не вызначаўся выдатнымі інтэлектуальнымі здольнасьцямі, таму пасьля чарговага фартэлю журналісты залямантавалі: «Да якога часу кароль будзе ганьбіць краіну на міжнароднай арэне!» — а ў СМІ пайшлі самыя розныя дыскусіі, ажно да адхіленьня ад улады несамавітага кіраўніка. Свабода слова! Яна ў Швэцыі мае працяглую гісторыю (гэты неад’емны элемэнт дэмакратычнага ладу быў заканадаўча замацаваны яшчэ з 1766 г.).

Характэрная рыса: цяпер у парлямэнце перавагу маюць сацыял-дэмакраты, аднак большасьць газэт належыць кансэрватарам.

Нарэшце, апошняя дэталь: штогод газэты друкуюць поўны сьпіс палітыкаў з пазначэньнем гадавога прыбытку, памеру зарплаты, крыніц паступленьняў на банкаўскі рахунак, асноўных расходаў...

І што цікава: гаворачы пра выдатныя дасягненьні ў пабудове трывалага і забясьпечанага грамадзтва, дзейснай і эфэктыўнай палітычнай сыстэмы, швэдзкая моладзь заўсёды зьвяртае ўвагу на тое, што «мова — гэта галоўны складнік незалежнасьці і дабрабыту нашае краіны».

**Сяржук Гусачэнка.**
**Фота аўтара**



ЛЕВЫМ ВОКАМ



# Трыюмф Барыскі

Якімі б ні былі літаратурныя якасьці новай кнігі Адама Глёбуса, яе прэзэнтацыя стала выдатнай культурнай правакацыяй і адлюстраваньнем дзіўных трэндаў у грамадзтве.

Я не пра вельмі дарагую анісавую гарэлку, якой на фуршэце прастаўляўся пісьменьнік. Гаворка пра антураж таго, што адбывалася падчас прыёму ў Доме літаратара. Функцыі аховы мерапрыемства ўсклалі на свае накачаныя трыцэпсы камбатанты нейкай праварадыкальнай сэкты. Упакаваныя ў чорныя кашулі, штандартэнфюрэры стаялі на ўваходзе і ўважліва сачылі, каб анархіст Канавальчык і яго крывое кру не прайшло бяз флаераў. На другім паверсе Г-ў арганізаваў кірмаш нацыяналістычнай атрыбутыкі — майкі са слоганам «Belarus über alles!», значкі з рунамі, паштоўкі з выявай паліцая — поўны набор для праварадыкальнай дэфлярацыі маладняку. Убачыўшы «чырвоную свалату», прапанаваў мне задаволіць сваё антыфашысцкае супэрэга — набыць згаданы Т-шырт і зрабіць аўтадафэ.

Нашто?! Маё сэрца сьпявала «Інтэрнацыянал» пры выглядзе гэтага трыюмфу волі.

Упэўнены, што абсалютная большасьць штурмавікоў ведала пра артыкул Глёбуса ў «Форуме-Лямбда», дзе ён (мяркую, дзеля эпатажу) дзяліўся з чытачамі сваім блакітным досьведам. А пра тое, што клясык літаратуры тварыў на Бабілёне, лепш яго маме ўвогуле не казаць.

Ні ў адной краіне сьвету праварадыкалам на прыйдзе ў іх голеныя арыйскія чарапушкі ідэя ахоўваць засьвечанага ў кантактах з пэдамі літаратара. Такое можа здарыцца толькі ў Беларусі. І гэта невыпадкова. Прыкладна ў тыя ж дні БТ пачало прамоўшэн туру земляко̆ў-музыкаў, што працуюць гастарбайтэрамі ў Расеі. Сярод тых, хто пацешыць наша вуха ў супэрафіцыйны Дзень Рэспублікі, — блакітнамесячны Барыска Маісееў.

І ніводны аматар праваслаўнай маралі нават не пачухаўся. Не залямантаваў, што ў «Асновах ідэалёгіі беларускай дзяржавы» няма ніводнага слова пра блакітны месяц. Такое можа здарыцца толькі ў Беларусі.

Для даведкі: на пачатку траўня ў супэркультурным і эўрапейскім Кракаве ледзь не адбыўся пагром нейкай блакітнай тусьні.

Дык што ў нас адбываецца — гістарычная міжканфэсійная талерантнасьць выходзіць на ўзровень міжкультурнай? Або славуты беларускі «пофіг» стварае нябачаную ў Эўропе антыксэнафобскую культуру? У любым разе, калі Грамшы мае рацыю, новая культурная гегемонія можа ў будучыні выклікаць цікавую палітычную надбудову.

**Лёлік Ушкін**

**Аб прэзэнтацыі «Дому» сям'ёю — старонка 12.**

Сяргей Балахонаў



# Надыдзе...

Надыдзе час бляндынак натуральных,
і ападуць з галоваў прах і хна
на радасьць гаспадынь прыватных пральняў,
на сьлёзы матылькоў герояў дня.

Настане час для белых транспарантаў
«Стагодзьдзе з дня народзін Брытні Сьпірс».
Мы будзем піць парэчкавую фанту,
прыгадваць марна, who is mister Ікс.

Мы ўспомнім дэманстрацыі пратэсту,
разгон іх і дагонку апасьля,
«Плач Яраполка» ў цэнтралізаваных тэстах
і традыцыйны тост «за о-ля-ля!».

Згадаем пашырэньне Эўразьвязу,
разьмены (зь пераплатаю!) кватэр,
жаданьні многіх рэчаў і адразу —
забіты хед-энд-шолдэрсам этэр.

Настане дзень прыродных беласьнежак,
і ападуць з галоваў хна і прах,
і страціць кожны сэнс усякі ўзьмешак,
і зьнікне ў фармаліне кожны страх.

КАІСА

# Шахматы дзеля шахматаў

20 чэрвеня стартуе мэмарыял Сакольскага па завочных шахматах. У галоўным турніры возьмуць удзел 15 чалавек ня толькі зь Беларусі, а і з Латвіі, Нямеччыны, Украіны, Расеі, Чэхіі. Турнір працягнецца тры гады, грашовых прызоў ня будзе.

Аляксею Сакольскаму летась споўнілася б 95. Постаць гэта знакавая для беларускіх шахматаў. Нарадзіўся ў Расеі, пераехаў у Беларусь у пачатку 1950-х. Сакольскі рэдка займаў высокія месцы ў турнірах, але яго будуць памятаць даўжэй, чым асобных супэргульцоў сучаснасьці. Майстар спорту, цудоўны трэнэр, ён выхаваў цэлае пакаленьне ўдзячных яму шахматыстаў. Напісаў некалькі кніжак, зь якіх і ў XXI ст. можна вучыцца шахматам. Почасту выпрабоўваў дэбют 1. b2-b4, названы яго імем. Нездарма за савецкім часам ладзіліся мэмарыялы славутага трэнэра — за кошт прафсаюзаў, аж пакуль для ведамства Ганчарыка шахматныя турніры не зрабіліся залішнім клопатам.

## Як бы вы згулялі?



**Пазыцыя з партыі М.Яворскі—З.Лыбін, мэмарыял Ежы Кшыштаня (1999—2003, па перапісцы). Ход чорных.**

Фэдэрацыя шахматаў думала-думала, як лепей успомніць пра Сакольскага, і вось — турнір адраджаецца безь яе. Цяпер асноўны цяжар яго праведзеньня ляжа на сапраўдных энтузіястаў гульні праз перапіску, балазе завочныя шахматы апошнім часам разьвіваюцца ў Беларусі з большым імпэтам, чым спаборніцтвы за дошкай. Варта адзначыць высілкі Зьмітра Лыбіна — першага беларускага міжнароднага грасмайстра МФЗШ (Міжнародная фэдэрацыя завочных шахматаў), выкладчыка Акадэміі музыкі, які, прэтэндуючы на першынство ў сьвеце, не забываецца і на патрэбы тутэйшых завочнікаў. Менавіта ён дамовіўся аб заснаваньні мэмарыялу з украінскімі калегамі. А грошы — што ж грошы? Думаецца, сам Сакольскі толькі цешыўся б з таго, што на фоне бясконцых фінансавых скандалаў, якія руйнуюць «вялікія шахматы», некалькі эўрапейскіх шахматыстаў узяліся пагуляць для ўласнага здавальненьня, дбаючы, што праўда, і пра ўласныя рэйтынгі.

**Вольф Рубінчык**



# БУДЗЬ СЯРОД ПЕРАМОЖЦАЎ

**Абвяшчаецца конкурсны набор на ліцэйскія курсы для вучняў 8—11 клясаў сярэдніх школаў Менску й Менскага раёну. На курсах вывучаюцца дысцыпліны базавай і сярэдняй школы на ўзроўні, дастатковым для здачы экстэрнам экзамэнаў на атрыманьне пасьведчаньня аб базавай і атэстату аб сярэдняй адукацыі. Паглыблена, у індывідуальным парадку, вывучаюцца дысцыпліны гуманітарнага цыклу: беларуская і замежныя мовы, літаратура, гісторыя, геаграфія. Навучаньне вядзецца выкладчыкамі колішняга Нацыянальнага гуманітарнага ліцэю імя Якуба Коласа паводле праграмаў, распрацаваных у Ліцэі.**

**Больш падрабязную інфармацыю пра ўмовы конкурсу можна атрымаць праз тэлефоны: 8-0296-29-59-03; 8-0296-39-27-15; 8-0296-33-48-59.**

**Курсы ладзіць індывідуальная прадпрымальніца Савіцкая У., пасьв. №690215877, выд. Менскім аблвыканкамам 4.01.2003.**

ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

**Аляксандру Л. зь Менску.** Тады думайце пра тых, хто ідзе за Вамі. Ёсьць вечнае правіла: прытрымлівайце дзьверы, выходзячы з мэтро.

**Віталю С. зь Менску.** Нават калі дэпутатаў «Рэспублікі» ўявіць марнатраўнымі сынамі, у незалежнага грамадзтва-бацькі няма падставаў не прымаць іх і не дапамагаць ім.

**Раману.** Нясьмешны выйшаў фэльетон.

**Запрашаем на падарожжа**

**27 чэрвеня (нядзеля) «Браслаўскі край».**



Маршрут: Менск—Глыбокае—Удзела—Мосар—Браслаўскія азёры—Слабодка—Браслаў—Опса—Відзы—Менск. Кантакты: 232-54-58; 8-029-622-57-20 (Зьміцер); 264-12-38; 8-029-776-24-35 (Павал).

ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

У выніку тэхнічнага збою страцілася частка абвестак, дасланых на электронную пошту з 11 да 15 чэрвеня. Просьба абвесткадаўцам паўтарыць іх. Перапрашаем.

**ВІТАНЬНІ**

**Нашу даражэнькую** Марыю Ігнатовіч віншуем зь юбілеем. Любім Вас моцна-моцна!

**Чароўная пані** Марыя! Віншуем Вас зь юбілеем і дзякуем за сьвятло Вашае душы. Сябры

**11 чэрвеня** хоцімскаму «Маладому фронту» два гады! Віншуем іх і зычым усяго найлепшага. Магілёўскі абласны МФ, каардынатар Сяргей Н.

**КАНТАКТЫ**

**Валянціна,** можна з Вамі пазнаёміцца? Нежанаты, маю кватэру і в/а. Валера Б. А/с 39, 222160, г.Жодзіна

**Пазнаёмлюся** з прывабнай беларусачкай (15—16 год). Арцём. Т.: 228-77-67

**Пазнаёмлюся** зь менчуком 25—35 год — разумным, мэтанакіраваным, сумленным. Маю шмат станоўчых якасьцяў. А/с 270, 220050, Менск

**КУПЛЮ/ПРАДАМ**

**Прадаю «walker» — прыладу,** зь якой лягчэй хадзіць пажылым і нямоглым людзям. Т.: 214-32-55

**Прадаецца дом** у г.Ветка. Ёсьць прыродны газ, пуня, склеп, лазьня, участак 12 сотак. Т.: (8-02330) 22-041

**Набуду** 2-гі том збору твораў Караткевіча і 2-гі том збору твораў Чорнага. Дар'я. Т.: 238-29-51

**ПРАЦА**

**Юрысконсульт** шукае працу па сумяшчальніцтве. Стаж 9 год. А/с 71, 220136, Менск

**Якасна выканаю** пісьмовыя працы па беларускай гісторыі, літаратуры і мове. Зьвяртацца загадзя. Юрась. Т.: 235-18-72 (пасьля 17-й)

**Якасныя пераклады** з ангельскае, польскае, французскае, украінскае на беларускую, ангельскую. Уладзь. Т.: (8-029) 678-33-38

**Беларускамоўная рэпэтытарка** па ангельскай, беларускай, швэдзкай мовах. Вопыт выкладаньня, замежныя стажаваньні. Т.: 202-97-20, Наста

**Запрашаем мастака**

для працы над кніжнымі і рэклямнымі праектамі. Акрамя выдатных прафэсійных якасьцяў пажадана павага да Сьвятога Пісаньня.

**Т.: 69-69-501. Віктар**

НЯ РЭЖЦЕ ГАЗЭТУ!

Увага! Цяпер прыватную абвестку ў «НН» (ня больш за 15 словаў) можна падаць звычайным лістом (а/с 537, 220050, Менск), а таксама электроннай поштай на адрас nn@promedia.by або разьмясьціўшы на форуме сайту www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

СЬМЕХ

**5 фактаў, якіх вы ня ведалі пра беларускамоўных:**

Як паказаў апошні перапіс насельніцтва, сярэднестатыстычны беларускамоўны ніякі не беларускамоўны. Ён — беларускамоўная.

* * *

Чым падобныя наркамаўка і наркаманка?

Абедзьве ня здатныя пісаць словы *цьвяроза* і *зьвязна*.

* * *

Ёсьць такія беларусы, якія думаюць, што «шакаляд з разынкамі» — гэта штосьці накшталт джэнтэльмэнскага набору. Любыя суайчыньнікі! Вы жорстка памыляецеся!

* * *

Згодна з статыстыкай, слова, якое найчасьцей ужываецца настаўнікамі беларускай мовы, гэта «Атакібудзе!»

* * *

— «От жа гэтая мова!» — кажуць злыя языкі.

**Павал Касьцюкевіч**

**Наша Ніва**
незалежная газэта
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі Наста Бакшанская
галоўны рэдактар Андрэй Дынько
фота-рэдактар Арцём Лява
карэктар Сяргей Петрыкевіч
карэктарка Галіна Рабянкова
нам. галоўнага рэдактара Андрэй Скурко
тэхнічны рэдактар Андрэй Чык
выдавец і заснавальнік Фонд выданьня газэты «Наша Ніва»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 8 палос фарматам А2, 4 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.
Наклад 3535. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 21.00 16.06.2004.
Замова № 3690.
Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а